Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 7 (5381)
ЧАЦВЕР
9
СТУДЗЕНЯ
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

НАРАДА КІРУЮЧЫХ РАБОТНІКАЎ МТС І ЗЯМЕЛЬНЫХ ОРГАНАЎ З КІРАЎНІКАМІ ПАРТЫІ І ЎРАДА.
ЗАКРЫЛАСЯ НАРАДА ПА ПЫТАННЯХ ВУДАЎНІЦТВА ПРЫ ЦК КП(б)Б І СНК БССР.
ЗАКРЫЎСЯ ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б
ЗЛЁТ СТАХАНАЎЦАЎ — МАЙСТРОЎ ВУГАЛЮ.
ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — ПЕРАДАВЫ АТРАД КП(б)Б.
ДЗЯТКОВА — СТАХАНАЎСКІЯ СУТКІ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ СТАЛІНСКАГА РАЁНА.
Б. ЛЬВОЎ — «ПЕРАБУДОВА» ПАЛКОЎНІКА ДЭ ЛЯ РОКА.
С. ДАВІДОВІЧ — ЯНКА МАЎР.
МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН К. КРАПІВЫ—ЕФІМАЎ—ЧАЛАВЕК КУЛЬТУРНЫ.
ЗА РУБЯЖОМ:
ПРАСОЎВАННЕ КІТАЙСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ
УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА Ў БУЭНОС-АЙРЭСЕ
МОРСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў ЛОНДАНЕ
ВЯЛІКАЯ ПАВОДКА ВА ФРАНЦЫІ
ЗАХВАТ ЯПОНЦАМІ ЧАХАРСКАЙ ПРАВІНЦЫІ
ПАДРЫХТОЎКА АБ'ЯДНАННЯ МАНЧЖОЎ-ГО З ПАЎНОЧНЫМ КІТАЕМ.

Перадавы атрад КП(б)Б

Менская партыйная арганізацыя закончыла праверку партыйных дакументаў. Пленум Менскага гаркома КП(б)Б, які закрыўся ўчора, падагуліў праведаную велізарную работу. Праверана 6.913 членаў партыі. Кожны комуніст быў дэтальна і ўсебакова праверан асабіста сакратарамі і членамі бюро гаркома. Вывучан увесь жыццёвы шлях, уся работа кожнага комуніста. Глыбока вывучана работа кожнай партыйнай арганізацыі.

Менская партыйная арганізацыя правяла праверку партыйных дакументаў на высокім палітычным узроўні. Уся партыйная арганізацыя была мабілізавана на правядзенне гэтай адказнейшай, важнейшай палітычнай работы. Менская партыйная арганізацыя ў выніку праверкі партыйных дакументаў яшчэ больш згуртавалася вакол Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і любімага правадыра партыі таварыша **СТАЛІНА**.

Не абышлося без памылак і хібаў. Аб гэтых памылках з усёй большавіцкай вострасцю і самакрытычнасцю гаварыў на пленуме сакратар Менскага гаркома КП(б)Б тав. **Рыскін**. У яго змястоўным дакладзе быў дан большэвіцкі аналіз той велізарнай работы, якая была праведзена па праверцы партдакументаў.

Менскі гарком, які праводзіў праверку пад штодзённым кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле ЦК КП(б)Б і асабіста таварыша **Гікало**, хутка, на-ходу выпраўляў дапушчаныя хібы і памылкі.

З вынікаў праверкі менскай партыйнай арганізацыі яшчэ і яшчэ раз мы бачым геніяльнейшую правільнасць сталінскага Цэнтральнага Камітэта, вялікую мудрасць геніяльнага правадыра, любімага ўсёй партыяй, усімі народамі совецкай краіны, таварыша **Сталіна**. Мы яшчэ і яшчэ раз бачым, як таварыш **Сталін** — вялікі прадаўжальнік справы **Леніна** — пільна ахоўвае нашу партыю, з найвялікшай клапатлівасцю і выключным замілаваннем бераже яе ад усякіх ворагаў, якія не раз прабавалі атакаваць яе або падтачыць яе гранітную магутнасць.

Шлях большэвіцкай партыі з самага яе зараджэння праходзіць праз жорсткія бі з рознымі контррэволюцыйнымі партыямі, апартуністычнымі плынямі і групоўкамі.

Нашы вялікія настаўнікі **Ленін і Сталін** заўсёды, на ўсіх этапах развіцця нашай партыі пільна сачылі за прошукамі ворагаў партыі, заўсёды бязлітасна выкрывалі самыя складаныя махінацыі і манеўры, накіраваныя на тое, каб аслабіць партыю, раскрывалі самую тонкую маскіроўку ворагаў, заўсёды ўзнімалі партыю і наносілі ворагу знішчальныя ўдары.

У пісьме ад 13 мая Цэнтральны Камітэт сігналізаваў усёй партыі аб тым, што ва многіх партыйных арганізацыях існуе недапушчальны хаос з уэтам і хаваннем партыйных дакументаў, з учотам комуністаў, што ў выніку ратазейства, страты большэвіцкай пільнасці ў партыю ашуканым спосабам прабраліся розныя жулікі і прахадзімцы — контррэволюцыйныя трацкісты, зіноўеўцы, эсэры, меншавікі і бундаўцы, кулакі і іншыя ворагі партыі. Цэнтральны Камітэт патрабаваў, каб партыя навяла большэвіцкі парадак у сваім уласным партыйным доме. Па ініцыятыве таварыша **Сталіна** была пачата праверка партыйных дакументаў. ЦК ВКП(б) непасрэдна штодзённа сачыў за ўсёй гэтай работай, своечасова выкрываючы памылкі і промахі асобных партыйных арганізацый.

Менская партыйная арганізацыя таксама аказалася значна засмечанай рознымі нацдэмаўскімі, трацкісцка-зіноўеўскімі, эсэраўскімі і іншымі класава-варожымі элементамі. У такіх установах, як Наркомасветы, БелАН і інш., выкрыты гнёзды класавых ворагаў, якія, прыкрываючыся партыйнымі білетамі, дзейнічалі даволі актыўна супроць партыі, супроць сацыялістычнай радзімы.

У Менску, сталіцы БССР, знаходзяцца цэнтральныя ўстановы. Тут сканцэнтравана кіраўніцтва ўсім жыццём рэспублікі. Зразумела, што сюды перш за ўсё імкнуцца пралезці класавыя ворагі.

У менскай партарганізацыі была значная група выхадцаў з контррэволюцыйных партый (эсэры, бундаўцы, меншавікі і інш.). Многія з гэтых людзей аказаліся нераззброенымі ворагамі партыі і совецкай улады.

У выніку праверкі значна ажывілася ўнутрыпартыйнае жыццё. Узнялася партыйная работа. Партыйныя арганізацыі ў значнай меры перамаглі арганізацыйную распушчанасць. Нанесен удар ратазейству, апартуністычнай благадушнасці, абломаўшчыне. Наведзен парадак ва ўчоце і хаванні партыйных дакументаў, за ўчоце комуністаў.

Комуністы пачалі больш чытаць, лепш вучыцца. Павысілася ідэйная ўзброенасць комуністаў, дысцыплінаванасць, адказнасць за ўсю партыю, за ўсю краіну. У гэтым найвялікшая сіла і значэнне праверкі.

Са сканчэннем праверкі партыйных дакументаў яшчэ не канчаецца барацьба за далейшае ачышчэнне радоў нашай партыі, за павышэнне яе боездольнасці.

Падсумаваўшы вынікі праверкі партыйных дакументаў, пленум Менскага гаркома вызначыў задачы, што стаяць перад партыйнай арганізацыяй, выходзячы з дырэктыў, даных снежаньскім пленумам ЦК ВКП(б).

Замацаваць вынікі праверкі партыйных дакументаў, весці далейшую барацьбу за ачыстку радоў партыі, у корані знішчыць малейшыя магчымасці пралазання ў яе рады класавых ворагаў — у гэтым галоўная і цэнтральная задача.

Замацаваць вынікі праверкі партыйных дакументаў, значыць падбальшэвіцку падрыхтаваць і так правесці абмен членскіх білетаў, кандыдацкіх і ўчотных картак, каб вызваліць партыю ад баласту, ад усіх пасіўных, абываталькіх элементаў, ад усіх, хто не апраўдвае высокага звання члена партыі. Замацаваць вынікі праверкі, значыць заўсёды будзіць, узнімаць, трымаць на вышыні пільнасць партыйных арганізацый, трымаць сухім большэвіцкі порах супроць усіх і ўсякіх ворагаў партыі і рабочага класа, заўсёды выкрываць іх варожыя махінацыі.

Менск стаў непазнавальным. Няма ўжо захалуснага чыноўніцкага горада з яго поўсаматужнымі прадпрыемствамі, з яго конкай, цёмнымі, брудным вуліцамі і яшчэ бруднейшымі акраінамі. Менск большэвіцкі, Менск — сталіца ордэнаноснай совецкай рэспублікі — гэта буйны індустрыяльны цэнтр з буйнымі прадпрыемствамі, абсталяванымі па апошняму слову тэхнікі, шматлікімі навучальнымі і навуковымі установамі, з стотысячным калектывам рабочых, мноствам студэнтаў і служачых.

Вырасла, загартавалася ў барацьбе за генеральную лінію партыі і менская партыйная арганізацыя. Яна была, ёсць і будзе перадавой арганізацыяй КП(б)Б.

Ламаючы ўсякія перашкоды, уся наша краіна пад кіраўніцтвам партыі **Леніна—Сталіна** быстра ідзе наперад па шляху пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадства.

Казачна быстра расце і шырыцца Менск. Будуюцца новыя прадпрыемствы, расшыраюцца старыя. Узнімаецца культурны ўзровень рабочага класа, калгаснікаў. І гэта ставіць усё новыя і новыя складанейшыя задачы перад партыйнай арганізацыяй.

СтахаНаўскі рух, які даволі шырока развіўся на многіх прадпрыемствах Менска, усё яшчэ не набыў патрэбнай масавасці. Фабрычна-заводскія партыйныя арганізацыі Менска яшчэ не ўзначалілі гэты рух. Толькі невялікая частка комуністаў з'яўляюцца стахаНаўцамі. Комуністы яшчэ не ўсюды ідуць у авангардзе гэтага руху.

Зусім інакш стаіць цяпер перад партыйнымі арганізацыямі задача кіраўніцтва. Нам трэба шырока прапагандаваць, развіваць стахаНаўскі рух, растлумачваць яго вялікае гістарычнае значэнне. Партыйным арганізацыям трэба стаць на чале гэтага руху. А гэта значыць, што комуністы самі павінны аўладаць культурай вытворчасці, глыбока вывучаць тэхналагічныя працэсы. Адсюль з асаблівай вострасцю стаіць задача ўсебаковай як палітычнай, так і тэхнічнай вучобы, задача ўзняцця палітычнага і культурнага ўзроўню кожнага комуніста.

Адным з важнейшых вынікаў праверкі партыйных дакументаў з'яўляецца тое, што партыйныя арганізацыі выявілі і высунулі новыя большэвіцкія кадры, якія з усёй адданасцю ўзяліся за даручаную ім партыяй работу. У менскай партыйнай арганізацыі выяўлена нямала такіх людзей. Толькі ў адным Сталінскім раёне вылучана на адказную партыйную і совецкую работу каля 70 чалавек. Па ўсёй менскай партыйнай арганізацыі на адказную работу вылучаны 144 чалавекі.

Але гэтым яшчэ не вычэрпваецца задача. Менская партыйная арганізацыя мае вялікія рэзервы. Яна павінна стаць кузняй выхавання новых большэвіцкіх кадраў не толькі для сваёй арганізацыі, але і для другіх сельскіх арганізацый КП(б)Б.

Няма сумнення, што менская партыйная арганізацыя, вызваліўшыся ад прымазаўшыхся класава-чужых элементаў, па-большэвіцку рэалізуе ўказанні снежаньскага пленума ЦК ВКП(б), будзе і ў далейшым займаць пачэснае перадавое месца ў радах КП(б)Б.

Нарада кіруючых работнікаў МТС і зямельных органаў з кіраўнікамі партыі і ўрада

3—7 студзеня ў зале пасяджэнняў ЦК ВКП(б) адбылася склікана Наркамземам СССР нарада дырэктароў, аграномаў, механікаў, бухгалтараў МТС і МТМ, загадчыкаў краявых і абласных зямельных упраўленняў і наркомаў земляробства рэспублік.

Нарада адкрылася грунтоўным дакладам народнага камісара земляробства Саюза ССР тав. Чэрнова аб вытворча-фінансавай дзейнасці мешына-трактарных станцый.

Бурнымі авацыямі былі спатканы прыняўшыя ўдзел у рабоце нарады таварышы **Сталін, Молатаў, Варашылаў, Арджанікідзе, Андрэеў, Чубар, Мікоян, Анціпаў, Якаўлеў і Чэрноў.**

На нарадзе выступіла 40 аратараў, у тым ліку дырэктары МТС і МТМ, старшыя аграномы, старшыя механікі і бухгалтары МТС, загадчыкі краявых і абласных зямельных упраўленняў і наркамаземы рэспублік.

У спрэчках выступалі: тав. **Анціпаў** — намеснік старшыні Соўнаркома СССР і старшыня Камісіі Совецкага Кантроля, які ўзяў пад крытыку сучаснае становішча фінансавай гаспадаркі МТС і арганізацыйныя непаладкі МТС, і тав. **Чубар** — намеснік старшыні Соўнаркома СССР, які паставіў перад работнікамі МТС рад задач, у асаблівасці задачу рашучага зніжэння сабекошту правадзімых МТС работ, эканоміі гаручага, эканоміі сродкаў на рамонт трактараў і машын.

Тав. Чубар высунуў патрабаванне зэканоміць дзяржаве ў 1936 годзе ў МТС'аўскай гаспадарцы некальк сот мільёнаў рублёў і мабілізаваць калектыў работнікаў МТС на паспяховае выкананне задачы, пастаўленай партыяй, аб давядзенні вытворчасці зярна праз 3—4 гады да 7—8 млрд. пудоў.

У заключэнне выступіў тав. **Якаўлеў** — загадчык сельгасаддзела ЦК ВКП(б), які падкрэсліў, што МТС ёсць **асноўнае звяно партыйнага і совецкага будаўніцтва ў вёсцы** і што справа далейшага ўмацавання калгасаў і выканання задання здабываць 7—8 млрд. пудоў хлеба ў велізарнай меры залежыць ад паляпшэння работы МТС.

Тав. Якаўлеў паведаміў, што прэзідыум нарады, па прапанове тав. Сталіна, уносіць у ЦВК прапанову аб узнагароджанні вышэйшай узнагародай Совецкага Саюза — ордэнамі — лепшых у Совецкім Саюзе дырэктароў, старшых аграномаў і старшых механікаў МТС.

Нарада закрылася пры бурнай авацыі ў гонар ЦК ВКП(б) і ўрада, у гонар таварыша **Сталіна**. Ва ўсіх канцах залы раздаюцца воклічы: «Клянемся выканаць задание аб вытворчасці 7—8 млрд. пудоў хлеба», «Старшыні Совета Народных Камісараў тав. Молатаву — ура!», «Правадыру партыі, правадыру народу тав. **Сталіну** — ура!», «Правадыру Чырвонай арміі тав. Варашылаву — ура!».

ЗАКРЫЛАСЯ НАРАДА ПА ПЫТАННЯХ БУДАЎНІЦТВА ПРЫ ЦК КП(б)Б І СНК БССР

Учора было заключнае пасяджэнне нарады па пытаннях будаўніцтва пры ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Выступіўшы першым на ранішнім пасяджэнні дырэктар менскага цагельнага завода № 5—6 тав. **Буцько** многа гаварыў аб усякіх аб'ектыўных прычынах, якія перашкаджаюць яму працаваць. Але калі яму задалі пытанне, як у яго на заводзе разгорнут стахаНаўскі рух, слоў для адказу аказалася мала. Зусім мізэрная колькасць стахаНаўцаў, невысокая прадукцыйнасць працы рабочых характарызуюць дрэнную работу яго прадпрыемства.

Старшыня ЦП саюза рабочых прамыслова-гарадскога і комунальна-жылёвага будаўніцтва т. **Бражынскі** ў сваім выступленні прабаваў на каго хочаш зваліць віну за дрэннае разгортванне стахаНаўскага руху на пабудовах. Ён імкнуўся даказаць, што ўжо 2—3 месяцы таму назад, як ЦП саюза моцна ўзялося за разгортванне стахаНаўскага руху, але перашкаджалі гаспадарнікі і інжынерна-тэхнічныя работнікі. Аднак, Бражынскі, урэшце, вымушан быў прызнаць, што ЦП саюза само «прахлопала» ў гэтай справе і з вялікім спазненнем пачало разгортваць масавую работу вакол пытанняў стахаНаўскага руху.

Пасля т. **Аўгусціновіча** і дырэктара Дзяржбанка т. **Галятоўскага** выступіў дырэктар Белкомунбудтраста т. **Глейберман**. Гаворачы аб падрыхтоўцы да будаўніцтва 1936 года, Глейберман заяўляе, што па лініі социяльна-культурнага і бытавога будаўніцтва трэст не мае яшчэ ні аднаго праекта, ні аднаго каштарыса. «Я літаральна сяджу і не ведаю, з чаго пачаць»,—гаворыць ён.

Аналагічнае становішча і па лініі школьнага будаўніцтва. СтахаНаўскі рух на пабудовах Белкомунбудтраста толькі ў зачатку.

Інжынер Белпромбудтраста тав. **Шэйма** ў сваім выступленні зачытаў ад імя дэлегацыі рабочых і інжынерна-тэхнічнага персанала Белпромбудтраста зварот да рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў прадпрыемстваў, вырабляючых будматэрыялы. Белпрамбудаўцы ўзялі на сябе абавязацельства: знізіць сабекошт на 15 проц., будаваць на «выдатна». У сваю чаргу яны патрабуюць ад прадпрыемстваў, вырабляючых будматэрыялы: даць у 1936 годзе не менш 450 мільёнаў цаглін высокай якасці, рэзкага ўзняцця якасці чарапіцы, а таксама ўзняцця якасці вапны з тым, каб адыходы складалі не больш 8 проц. супроць 30—40 проц. у даны момант.

Бурнай і доўгай авацыяй сустракаюць удзельнікі нарады з'яўленне на трыбуне сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Гікало**. Значную частку сваёй прамовы тав. **Гікало** прысвячае пытанням стахаНаўскага руху ў БССР і заклікае вучыцца ў гэтай справе ў данбаскіх большэвікоў. Намячаючы канкрэтныя задачы па будаўніцтву ў сувязі з стахаНаўскім рухам, тав. **Гікало** асабліва вялікую ўвагу адводзіць пытанням механізацыі на пабудовах, вырабу дастатковай колькасці будаўнічых матэрыялаў на прадпрыемствах БССР і патрабуе самых чулых і ўважлівых адносін да стахаНаўцаў, да іх культурна-бытавых патрэб.

Далей слова атрымліваюць: дырэктар трэста будматэрыялаў тав. **Бампі**, прадстаўнік Белсампромсаюза т. **Гапонаў**, дырэктар Белпромбудтраста т. **Васерман** і нарком комунальнай гаспадаркі БССР т. **Амбражунас**.

Спатканы бурнай авацыяй выступае **Н. М. Галадзед**. Тав. Галадзед моцна раскрытыкаваў незадавальненне будаўнічымі арганізацыямі планавай і бюджэтнай дысцыпліны і падрабязна спыніўся на пытаннях складання праектаў і каштарысаў па будаўніцтву, патрабуючы ад кіруючых работнікаў прамысловасці і будаўнічых арганізацый глыбока ўваходзіць у сутнасць гэтага пытання.

Тав. Галадзед зварачае ўвагу ўдзельнікаў нарады на ролю інжынерна-тэхнічных работнікаў у стахаНаўскім руху і ставіць задачу клапатліва абслугоўваць патрэбы стахаНаўцаў.

Намеснік наркома мясцовай прамысловасці БССР т. **Геаргадзе** ў сваёй прамове спыняецца, галоўным чынам, на пытаннях зніжэння сабекошту будаўніцтва і ўзмацнення механізацыі на пабудовах.

Пад гром апладысментаў, пераходзячых у авацыю, нарада прымае прапанову аб пасылцы прывітальнай тэлеграмы таварышу **Сталіну**.

Пасля невялікага заключнага слова загадчыка прамыслова-транспартным аддзелам ЦК КП(б)Б тав. **Готфрыда** нарада закончыла сваю работу.

ДА ДРУГОЙ СЕСІІ ЦВК САЮЗА ССР VII СКЛІКАННЯ

Адкрыццё другой сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР VII склікання адбудзецца 10 студзеня 1936 г., у 18 гадзін, у Крэмлі, у памяшканні Вялікага крэмлёўскага палаца.

Парадак дня сесіі:

1. Народнагаспадарчы план Саюза ССР на 1936 год. **Дакладчыкі тт. Молатаў В. М. і Мікоян А. І.**
2. Адзіны дзяржаўны бюджэт Саюза ССР на 1936 год. **Дакладчык тав. Грынько Г. Ф.**
Судаклад бюджэтнай камісіі ЦВК Саюза ССР аб адзіным дзяржаўным бюджэце Саюза ССР на 1936 год. **Дакладчык тав. Чуцкаеў С. Е.**
3. Справаздача аб выкананні адзінага дзяржаўнага бюджэту Саюза ССР за 1934 год. **Дакладчыкі тт. Грынько Г. Ф. і Чуцкаеў С. Е.**
4. Справаздачны даклад Наркамата харчовай прамысловасці Саюза ССР. **Дакладчык тав. Мікоян А. І.**
5. Зацвярджэнне пастаноў, прынятых у перыяд паміж сесіямі і падлягаючых, на падставе арт. 18 Канстытуцыі Саюза ССР, зацвярджэнню сесіяй ЦВК Саюза ССР. **Дакладчык тав. Акулаў І. А.**

Сакратар ЦВК Саюза ССР І. А. АКУЛАЎ.

Пасяджэнне групы ВКП(б) ЦВК Саюза ССР адбудзецца тамжа (у Вялікім крэмлёўскім палацы), у 17 гадзін 10 студзеня.

ЗЛЁТ СТАХАНАЎЦАЎ — МАЙСТРОЎ ВУГАЛЮ

СТАЛІНО, 7 студзеня. (БЕЛТА). З небывалым уздымам сустрэла сталіца Данбаса адкрыццё злёта стахаНаўцаў — майстраў вугалю. Зала тэатра, дзе адбываецца злёт, запаўняецца дэлегатамі.

У 18 гадзін за сталом прэзідыума з'яўляецца старшыня ЦВК СССР і Ўсеўкраінскага ЦВК Г. І. Петроўскі, разам з ім таварышы Саркісаў, Рухімовіч, Вайнаў, Шмідт і іншыя.

Злёт майстраў вугалю адкрывае старшыня ЦК вугольшчыкаў тав. **Шмідт**. Яго першыя словы прысвечаны таму, хто акружан гарачай любоўю ўсёй краіны, таму, хто з'яўляецца арганізатарам вялікіх перамог краіны і натхнёнем стахаНаўскага руху — **вялікаму правадыру народу таварышу СТАЛІНУ.**

Бурнай авацыяй сустракаюць стахаНаўцы імя любімага правадыра. Поўным захапленнем прывітаннем няма канца. Нясецца магутны вокліч: «Таварышу **Сталіну** стахаНаўскае «ура»!». Калі ўносіцца прапанова выбраць ганаровым старшынёй злёта стахаНаўцаў таварыша **Сталіна**, дэлегаты ўстаюць і наладжваюць новую авацыю. Усе пяюць «Інтэрнацыянал».

У ганаровы прэзідыум пад бурныя апладысменты выбіраюцца Палітбюро ЦК ВКП(б) і таварышы Ежоў, Хрушчоў, Любчэнка, Дзімітраў, Тэльман.

З вялікай прывітальнай прамовай ад імя ЦК КП(б)У і ўрада на злёце выступіў сустрэты бурнымі апладысментамі тав. **Г. І. Петроўскі**. У канцы пасяджэння злёта з яркім, поўным зместу дакладам аб задачах вугольнага Данбаса ў 1936 годзе ў сувязі са стахаНаўскім рухам выступіў тав. **Саркісаў**.

Злёт стахаНаўцаў — майстраў вугалю атрымаў прывітальныя тэлеграмы ад Г. І. Петроўскага, П. П. Любчэнка, ад акадэмікаў, вучоных, артыстаў, пісьменнікаў, інжынераў, пілотаў — знатных людзей краіны.

**

СТАЛІНО. 8 студзеня. (БЕЛТА). Ранішняе пасяджэнне ўсёданецкага злёта стахаНаўцаў—майстроў вугалю пачалося вялікім дакладам намесніка начальніка Галоўвугаля тав. **Бажанава** аб задачах вугольнага Данбаса ў 1936 годзе ў сувязі са стахаНаўскім рухам.

— СтахаНаўскі рух,—гаворыць тав. Бажанаў,—дае нам поўную магчымасць у бліжэйшыя год-два **дагнаць і перагнаць капіталістычную прамысловасць Амерыкі, дагнаць і перагнаць Рур.**

Тав. Бажанаў заканчвае свой даклад выражэннем цвёрдай упэўненасці ў тым, што Данбас у 1936 годзе будзе ў першых радах вугольнай прамысловасці Саюза.

Пасля даклада т. Бажанава першым у спрэчках выступае **Алексей Стаханоў**. Злёт наладжвае яму авацыю.

— Што адбылося на нашай шахце за гэтыя 4 месяцы?—пытае тав. Стаханоў.—Мы, перайшоўшы на работу па-стахаНаўску, сталі перавыконваць на шахце план на 200—220 проц. і не толькі датэрмінова выканалі план, але далі зыш плана 33 тыс. тон вугалю.

Сцяг «Правды» зараз на шахце № 22. Мы, стахаНаўцы шахты «Цэнтральная-Ірміна», заяўляем, што будзем біцца за сцяг «Правды».

МАРЫЯ ЛЯХОЎСКАЯ, комсамолка-стахаНаўка бручнага цэха віцебскай швейнай фабрыкі «Сцяг Індустрыялізацыі», удзельніца пешага пераходу ў супроцьгазах Віцебск—Менск, парашутыстка, выконвае план на 200 проц. Гэтымі днямі тав. Ляхоўская працавала ў супроцьгазе 7 гадзін і сваё вытворчае задание выканала на 199 проц.

Фото С. ГРЫНА.

ЗАКРЫЎСЯ ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б

Ранішняе пасяджэнне пачалося са спрэчак па дакладу сакратара гаркома тав. **Рыскіна** аб выніках праверкі партыйных дакументаў па менскай партарганізацыі.

Члены бюро гаркома тт. **Літвін, Варончанка, Жуковіч** і іншыя ўдзельнікі пленума яркімі прыкладамі дапоўнілі даклад тав. Рыскіна аб велізарнейшым палітычным значэнні праверкі партдакументаў у справе ачысткі радоў партыі ад класава-варожых элементаў, якія ашуканчым шляхам пралезлі ў нашу партыю.

У працэсе праверкі гарком КП(б)Б вылучыў вялікую колькасць адданых большэвікоў, людзей, якія раней былі непрыкметнымі, на партыйную, гаспадарчую і профсаюзную работу. На гэтым спыніліся ў сваіх выступленнях т. **Літвін** — сакратар оргбюро Сталінскага райкома, т. **Шамес** — сакратар парткома завода імя Кірава, т. **Суражынскі**—сакратар парткома трамвайнага парку і іншыя.

Праверка выявіла рад слабых месц у пастаноўцы партыйнай прапаганды і агітацыі. Аб гэтым падрабязна гаварылі ў сваіх выступленнях тт. **Чыжова, Вайчун** — сакратар парткома фабрыкі імя Тэльмана, **Бурштэйн**—сакратар парткома Медінстытута, **Канапацкі** — сакратар парткома завода ланцугоў Галя і іншыя.

Дырэктары прадпрыемстваў — удзельнікі пленума тт. **Шоўкаў, Любін** — у сваіх выступленнях указалі на магутнае разгортванне стахаНаўскага руху на прадпрыемствах пасля прамовы таварыша **Сталіна** на нарадзе стахаНаўцаў.

Сакратар ЦК і Менскага гаркома ЛКСМБ т. **Аўгустайціс** вялікую частку сваёй прамовы прысвяціў задачам справаздачна-перавыбарчай кампаніі ў комсамоле і выхаванню моладзі.

З выключнай увагай удзельнікі пленума выслухалі прамову дырэктара саўгаса імя Калініна т. **Гарбуза**, узнагароджанага ўрадам СССР ордэнам Працоўнага сцяга. Ён расказаў аб вялікім уздыме рабочых саўгаса ў сувязі з узнагародай саюзным урадам 11-ці выдатнікаў сельскай гаспадаркі БССР і іх гатоўнасці заваяваць сталінскі ўраджай.

Пленум праходзіў на высокім ідэйна-палітычным узроўні. Работа пленума паказала, што менская партарганізацыя, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з тав. **Гікало**, у выніку праверкі партдакументаў яшчэ больш умацавалася і згуртавалася вакол ЦК ВКП(б) і любімага **правадыра** таварыша **Сталіна**.

Пленум прыняў **рэвалюцыю**, у якой намечан рад практычных мерапрыемстваў па замацаванню рэзультатаў праверкі партдакументаў і падрыхтоўцы да правядзення абмену партыйных дакументаў, прыёму ў рады партыі, як гэтага патрабуе снежаньскі пленум ЦК ВКП(б).

СВЯТА ІЛЬНУ Ў КАЛІНІНЕ

КАЛІНІН, 8 студзеня. (Спец. кар. «Звязды»). 7 студзеня выставачны камітэт арганізаваў урачысты вечар, прысвечаны лепшым ударнікам калгасных палёў Калінінскай вобласці. Звыш 500 перадавых калгаснікаў і калгаснік вобласці, лепшых стахаНаўцаў па ільноапрацоўцы, дзесяткі майстроў ільну, якія прыехалі на выстаўку з іншых абласцей і рэспублік, прынялі ўдзел у вечары.

Каля 300 старшынь калгасаў, брыгадзіраў і калгаснікаў прамураваны. Першую прэмію выстаўкома атрымаў калгас «Дружба», Бежэцкага раёна, здаўшы лён у сярэднім 20 нумарам і дабіўшыся 7 цэнтнераў валакна з гектара.

Прэмія гэта наступная: ганаровы атэстат, грузавы аўтамабіль, бібліятэка, радыёўстаноўка, тэлефон для праўлення калгаса, дамы для калгаснікаў. Старшыня калгаса атрымаў персанальную прэмію — легкавую машыну.

Бурнымі апладысментамі сустрэлі ўдзельнікі вечара пастанову выстаўкома аб прэміраванні патэфонамі беларускіх стахаНаўцаў ільну тт. **Лысова і Быкоўскую**.

У гэты-ж вечар у горадзе быў наладжан карнавал. На цэнтральнай вуліцы горада хлынуў паток удзельнікаў карнавала. Дзесяткі тысяч, працоўных выйшлі на вуліцу ў масках і касцюмах.

Сёння кіраўнік калінінскіх большэвікоў тав. **Міхайлаў і старшыня** выканкома тав. **Іваноў** прынялі беларускую, маскоўскую, ленінградскую і іншыя дэлегацыі стахаНаўцаў.

Сяброўская гутарка і абмен думкамі працягваліся звыш двух гадзін. Беларуская дэлегацыя перадала таварышу Міхайлаву пісьмо, у якім гаворыцца:

«Ад усёй душы апладзіруем арганізатарам выстаўкі і тым дзесяткам тысяч калгаснікаў і калгаснік, якія сваёй большэвіцкай работай заваявалі славу калінінскаму ільну».

Дэлегацыя абавязалася дабіцца ў 50 калгасах БССР на плошчы не менш 200 гектараў па 10 цэнтнераў валакна з кожнага гектара.

Уся дэлегацыя БССР узнагароджана значкамі ўдарнікаў барацьбы за лён.

Тав. Міхайлаў прасіў дэлегатаў перадаць прывітанне тт. **Гікало, Чэрвякову, Галадзеду і Валковічу** і ўручыць ім значкі ўдарнікаў ільну.

Сёння беларуская дэлегацыя вывучае павільён экспарту і механізацыі.

Л. КАПЛАН.

СТАХАНАЎСКІЯ СУТКІ на прадпрыемствах Сталінскага раёна

Дзень напярэдадні 1936 года быў адзначан па ўсіх прадпрыемствах Сталінскага раёна новымі вытворчымі дасягненнямі. Вопыт стаханаўскіх змен і сутак, праведзеных у шахтах Данбаса, з'явіўся магутным стымулам для масавага ўцягнення ў стаханаўскі рух новых сотень і тысяч рабочых. Гэты вопыт быў падхоплен перадавымі прадпрыемствамі нашага раёна.

29 снежня на кандзіцерскай фабрыцы «Комунарка» ў карамельным цэху была праведзена стаханаўская змена. У гэтай змене сканцэнтравалі ўсіх стаханаўцаў цэха. План быў выканан на 195 проц.

Вечарам таго-ж дня оргбюро Сталінскага райкома склікала нараду трыкутнікаў буйнейшых заводаў і фабрык. Тут мы абгаварылі канкрэтна пытанне аб правядзенні 31 снежня стаханаўскай змены і сутак на буйнейшых прадпрыемствах раёна (фабрыка «Комунарка», заводы імя Кірава і імя Варашылава).

Якія-ж вынікі мы атрымалі 31 снежня? Завод імя Кірава ў гэты дзень выканаў план на 191 проц., брак па ліццю знізіўся з 5,7 проц. да 3,9 проц. Фабрыка «Комунарка» выпусціла за суткі 75 тон прадукцыі замест 42 тон па плану (182 проц.). Самы буйны механічны цэх завода імя Варашылава выканаў план на 187 проц.

2 студзеня оргбюро райкома склікала пашыраную нараду трыкутнікаў усіх прадпрыемстваў, на якой падвялі вынікі праведзеных стаханаўскіх сутак. Лепш за ўсіх арганізавала гэту справу фабрыка «Комунарка». Кіраўніцтва фабрыкі пачало падрыхтоўку непасрэдна з нізоў. У кожнай брыгадзе, кожным цэху былі дэтальна абгавораны мерапрыемствы, якія неабходна правесці ў сувязі са стаханаўскай зменай. Кожная работніца ўзяла на сябе канкрэтныя абавязацельствы па перавыкананню нормы.

Апрача таго партком правёў спецыяльную нараду парторгаў, агітатараў і рэдактароў штодзённак. 31 снежня раніцой агітатары праводзілі гутаркі ў брыгадах на тэму «Што мы павінны даць за сёнешні дзень». Уся фабрыка змагалася за 75 тон прадукцыі.

Прыступілі да работы. Адміністрацыя цэха правяла выключную аператыўнасць і наладзіла ўлік так, што кожную гадзіну работніца магла ведаць, колькі яна выпрацавала. У абедзены перапынак падлічылі выпрацоўку за поўзмены. Па большасці брыгад ужо к гэтаму часу была перавыкананая дзённая норма.

За дзень па цэхах і брыгадах было выпушчана 25 бюлетэняў. Яны мабілізоўвалі людзей, ставілі канкрэтныя задачы.

Характэрна, што за 31 снежня на фабрыцы не было ні аднаго выпадку траўматычных захворванняў, у той час як у звычайныя дні бывае ў сярэднім да 7 выпадкаў. У два разы зменшыўся лік наведвальнікаў амбулаторыі.

Добра праведзеная масава-палітычная і агітацыйная работа забяспечыла калектыву фабрыкі вялікі поспех.

Мы так падрабязна спыніліся на вопыце фабрыкі «Комунарка» таму, што ён з'яўляецца найбольш каштоўным і вартым пераймання ўсімі прадпрыемствамі.

На заводзе імя Кірава і імя Варашылава не была праведзена такая шырокая масавая работа. Але і тут ёсць пэўныя дасягненні. На заводзе імя Варашылава да кожнага варштата былі прымацаваны слесары-наладчыкі, якія пільна сачылі за нармальнай работай варштатаў.

Калі мы на нарадзе трыкутнікаў намячалі на 5 студзеня правядзенне стаханаўскіх сутак па ўсяму раёну, то ў аснову падрыхтоўчай работы быў прынят вопыт фабрыкі «Комунарка».

5 студзеня стаханаўскія суткі прайшлі з яшчэ большым поспехам. Завод імя Кірава выканаў план на 212 проц., імя Варашылава на 180 проц., «Большэвік» на 159,4 проц., «Комунарка» на 148 проц., фабрыка імя Крупскай на 145,6 проц., Мясакамбінат на 140 проц., дражджавы завод «Чырвоная зара» (стаханаўская трохдзенка)—113,9 проц.

Трэба адзначыць, што кіраўніцтва завода імя Кірава і на гэты раз не правяло дастатковай масава-падрыхтоўчай работы да стаханаўскіх сутак. Брыгады не ведалі, за што яны змагаюцца. 9 чалавек у гэты дзень спазніліся на работу на 5 мінут. Двое рабочых механічнага цэха прыступілі да работы са спазненнем на 15 мінут, а двое зусім не выйшлі на работу без уважлівых прычын. Больш таго, нават начальнікі цэхаў і тыя прышлі на завод вельмі позна. Начальнікі лінейнага і механічнага цэхаў — тт. Копач і Мацюш — прышлі на завод першы за 5, а другі за 15 мінут да пачатку работы.

Аналагічныя факты мелі месца і на заводзе імя Варашылава.

За гэтыя два стаханаўскія дні на прадпрыемствах раёна выявілася некалькі сот новых стаханаўцаў. Вядучая роля ў гэтыя дні на вытворчасці была за комуністамі. Яны паказалі ўзоры высокай прадукцыйнасці працы, ведучы за сабой усю масу рабочых. Работніцы-комуністкі фабрыкі «Комунарка» Масналец і Шнейдзрава выканалі свае нормы на 180—200 проц. Парторг першага хромавага цэха завода «Большэвік» т. Мініноўскі даў 385,2 проц. нормы, парторг Запольскі — 227,7 проц., прафорг комуніст Баданес — 224,4 проц. і інш. На заводзе імя Кірава і «Комунарка» ўсе комуністы, якія працуюць непасрэдна ля варштатаў, з'яўляюцца стаханаўцамі.

Нельга абыйсці такія адмоўныя з'явы, калі пасля правядзення стаханаўскіх змен усе цэхі фабрыкі «Комунарка» загружаны гатовай прадукцыяй, бо не хапае вагонаў для адпраўкі. Такое-ж становішча і на дражджавым заводзе «Чырвоная зара». Завод «Большэвік» недастаткова забяспечваецца сыравінай. Пры поўным забеспячэнні сыравінай завод мог-бы ў паўтара раза павысіць сваю прадукцыйнасць.

Зараз мы пачалі падрыхтоўку да Дня ўдарніка. У гэты дзень нашы прадпрыемствы пры правядзенні стаханаўскіх сутак і змен пакажуць яшчэ больш выдатныя поспехі.

ДЗЯТКОВА
Нам. сакратара оргбюро Сталінскага райкома КП(б)Б.

На заводзе імя Кірава праводзіцца спецыяльная работа са спачуваючымі. Праведзены заняткі па працоўцы праграмы і статута ВКП(б), што партыя патрабуе ад комуніста ў асобістым быту і ў грамадскай рабоце, геаграфічны агляд Абісініі і інш.
На здымку: сакратар парткома т. Шамас праводзіць заняткі з групай спачуваючых.

НА БУДАЎНІЦТВЕ ПАЛАЦА ПІОНЕРАЎ І ОКЦЯБРАТ

Магутны фантан б'е з вялікай сілай уверх. Вада падымаецца і дробнымі кроплямі падае ўніз. Фігуры звяроў—ільва, тыгра, антылопы цесным колам абступілі водазбор. Паабапал фантана распасціраецца сад са сваімі выспанымі дарожкамі. Вы заходзіце ў будынак. Ля галоўнага ўваходу стаяць дзве мастацкі аформленыя фігуры: піонеркі-гарніста і авіямадэліста.

У вестыбюлі бюсты і барэльефы Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, Гікало. Тут падлога з натуральнага мрамару, сцены з штучнага мрамару. Па мраморнай лесніцы вы заходзіце ў залу. Скураная мэбля пакрыта чыстымі белымі пакрывалами і расстаўлена роўнымі радамі ўдоўж сцяны. Побач фізкультурная зала. На сцэнах жывапіс на фізкультурныя тэмы: гульня ў валейбол, гарадкі, кракет, купанне ў рэчцы і шмат іншага. На падлозе высланы дарагія дываны.

У чытальні в мастацкім густам расстаўлены нізенькія кніжныя шафы. Дзеці падыходзяць к шафе, выбіраюць любую кніжку і чытаюць. Далей ідуць пакоі электратэхнікі, транспарту і т. д. Так будзе выглядаць палац піонераў і окцябрат у Менску.

Як-жа ідзе будаўніцтва палаца?

Будаўнічыя работы амаль ужо закончаны. Засталося арабіць скляненні над капельняй з укладкай металічных бэлек, правесці трубапроводы для вадзянога ацяплення і паветрадуваў вентыляцыі. Зараз бетоншчыкі заліваюць падаконнікі бетонам і загатаўляюць ступені для лесніц.

Брыгада тынкоўшчыкаў скончыла работу па атынкоўцы столі і карнізаў у чытальнай залі. Па пясчарна-бетоннаму цэху зараз прыступілі да апалубкі балкона ў фізкультурнай залі і перакрыцця вестыбюля галоўнага ўваходу.

Група архітэктараў працуе над знадворнай аддзелкай пакояў. Мэблевая фабрыка імя Галадзеда прыступіла да вырабу скураной мэблі. Над барэльефамі для фізкультурнай залы працуе скульптар Керзін. Скульптар Глебаў робіць партрэты правадыроў нашай партыі, скульптар Бразер робіць бюст Сталіна і Леніна. Над фігурамі авіямадэліста і піонеркі-гарніста працуе скульптар Грубе.

І. ЕСЬМАН.

Пісьмы аб культрабоце

СЫРА І ПУСТА...

У фізкультурнай зале холадна і сыра. На бруднай падлозе валяюцца абломкі цэглы і глыны. Адно паламанае крэсла і такога-ж выгляду маленькі столік прадстаўляюць сабою ледзь не ўсю абстаноўку пакоя. У адным куце пакоя — раяль, пакрыты тоўстым пластом пылу.

Аб тым, што гэты пакой усё-ж прызначан для фізкультурнай работы, гаварыў толькі спартыўны «конь», які стаіць спакойна з 1934 года.

Якраз у 1934 годзе ў гэтым пакоі ва ўсю кіпела работа. Па словах тав. Абезгаўза—загадчыка клуба «Сцяг індустрыялізацыі» — гэты пакой не змяшчаў усіх жадаючых займацца спортам. На фабрыцы-ж звыш 3.000 чалавек моладзі. Зараз фізкультурная зала пустуе.

Паверхам вышэй знаходзіцца так званая малая зала. Па ўнутраному абсталяванню пакоя цяжка меркаваць, якое яго прызначэнне. Два паламаныя крэслы, у якіх нейкім цудам уцалелі яшчэ дзве ножкі. Тут-жа не стаіць, а валяецца паламаны стол. Нейкім чынам сюды трапіў «спартыўны конь», з якога нехта паспеў ужо садрапць скуру. Крыху далей валяюцца фанерныя лісты і некалькі паламаных вёслаў. У більярднай чутны былі галасы.

Але і гэты пакой нічога агульнага з культурнай більярднай не мае. На бруднай падлозе за ўсіх кутках валяюцца дошкі, трубы і рознае барахло. Вешалкі пры клубе наогул няма, і польты тутжа валяюцца проста на сталах. У пакоі накурана, што аж дыхаць няма чым. Аказваецца, што більярдны пакой з'яўляецца і курыльняй. Тут-жа і буфет, але ён адкрыты толькі ў часе сходаў або кінопастановак.

У чытальні пуста. Ні аднаго чалавека. Загадчык чытальні тлумачыць гэта тым, што сюды часта збіраюцца хлапчукі, шумяць, галдзяць і спакойна не дадуць прачытаць газету. Абстаноўка чытальні таксама непрыемная. Вокны без фіранак, электрычнае люстра запылена, добрых настольных абрусоў таксама няма, не гаворачы ўжо пра мэблю, якая ў чытальні вельмі патрэбна.

Тав. Абезгаўз падносіць нам памяты ліст паперы. Чытаем: пры клубе працуе харавы гурток, драматычны, мастацкі, яўрэйскі драмгурток, шахматна-шашачны, танцклас, духавы аркестр, жаночы духавы аркестр, джаз і фізкультурны гурток.

Як працуе фізкультурны гурток, мы ўжо азнаёміліся. Ніякай фізкультурнай работы і ў памяне няма. Шахматна-шашачны гурток існуе таксама толькі на паперы. Драматычныя гурткі амаль не працуюць. За мінулы год была пастаўлена толькі адна п'еса. Да гэтага часу адміністрацыя клуба не можа забяспечыць гэтыя гурткі кіраўніком. Духавыя аркестры працуюць з вялікімі перабоямі. Імі кіруе нейкі Іофе, які акуратна атрымлівае 360 рублёў у месяц, але ўдзяліць клубу патрэбную ўвагу ён ніяк не можа, бо ён паміма работы ў клубе фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» халтурыць яшчэ ў розных мясцах. Па сутнасці працуюць ўсяго толькі два гурткі — харавы і струнны, якія карыстаюцца добрым поспехам.

Некалькі слоў пра кінопастановкі. Культаддзел ЦСПСБ ўжо даўно абяцаў агучыць клубнае кіно, але абяцанне так і засталося адным абяцаннем. Што датычыць нямых кінопастановак, то віцебскае аддзяленне Белдзяржкіно як правіла пускае ў клубы тыя кінокарціны, якія ўжо даўным даўно прайшлі гарадскі экран. Ясна, што нікому няма цікавасці яшчэ раз іх праглядаць.

Такі клуб швэйнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» як ён ёсць, з усім сваім культурным абслугоўваннем. І не дзіва, што ў ім заўсёды пуста.

Жыць стала лепш і весялей, — заяўляюць словамі нашага любімага правадыра таварыша Сталіна сотні і тысячы стаханаўцаў. Дайце-ж ім месца, дзе яны сапраўды маглі-б культурна і весела правесці вольны ад работы час.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.
ФЛЯУМЕНБАУМ.
Віцебск.

Расчляненне Кітая

ПАДРЫХТОЎКА АБ'ЯДНАННЯ МАНЧЖОУ-ГО З ПАЎНОЧНЫМ КІТАЕМ

ТОКІО. Усе японскія газеты аддаюць вялікую ўвагу паездцы таварыша міністра замежных спраў Манчжоу-Го Охасі (японец) у Паўночны Кітай. Газеты лічаць, што асноўнай задачай Охасі з'яўляецца заключэнне саюза паміж Манчжоу-Го і «аўтаномным» урадам Усходняга Хэбэя (урад Інь Жу-гена).

Бейпінскі карэспандэнт агенцтва «Дэмпо цусін» піша, што Манчжоу-Го ўжо рашыла ўстанавіць «дыпламатычнае прадстаўніцтва ў Тунчжоу» (сталіца ўрада Інь Жу-гена), тым больш, што гэты ўрад карыстаецца «вялікім давер'ем японскіх ваенных улад у Паўночным Кітаі».

—о—

ЧАРГОВАЯ ПРАВАКАЦЫЯ

ТОКІО, 7 студзеня. (БЕЛТА). З Бейпіна паведамляюць, што ля гарадскіх варот Бейпіна 5 студзеня некалькі японскіх афіцэраў былі абстраляны зазду кітайскімі салдатамі, якія ахоўвалі вароты.

Ні адзін з японскіх афіцэраў не быў паранен. Аднак, — пішуць газеты, — японскія ваенныя ўлады Паўночнага Кітая прыдаюць інцыдэнту вялікае значэнне, і японскі ваенны агент у Бейпіне Імаі ў той-жа дзень заявіў суровы пратэст.

ЗАХВАТ ЯПОНЦАМІ ЧАХАРСКАЙ ПРАВІНЦЫІ

ШАНХАЙ, 7 студзеня. (БЕЛТА). Мясцовыя кітайскія газеты пацвярджаюць паведамленні аб захвапе япона-манчжурскімі войскамі 6 паўночных паветаў Чахарскай правінцыі (Унутраная Манголія), указваючы, што апошнім быў занят 5 студзеня павет Шандзу. Паводле слоў газет, частка тракта Калган-Улан-Батор занята японцамі, устанавіўшымі сістэму вобыскаў і абкладання высокімі таможаннымі пошлінамі ўсіх тавараў, якія ідуць гэтым шляхам у Мангольскую народную рэспубліку.

***

БЕЙПІН, 6 студзеня. (БЕЛТА). Каментуючы паведамленне аб захвапе япона-манчжурскімі войскамі павета Чжанбэй (Чахарская правінцыя), «Манчжурыя дэйлі ньюс» піша: «Чахарская правінцыя разам з усім Паўночным Кітаем адрываецца зараз ад нанкінскага ўрада». Газета сцвярджае, што ў хуткім часе ўслед за Чахарам той-жа лёс спаткае і іншыя правінцыі Унутранай Манголіі—Суйюань і Нінся.

***

ТОКІО, 7 студзеня. (БЕЛТА). Згодна апошніх паведамленняў бейпінскага карэспандэнта агенцтва «Дэмпо цусін», войскі Лі Шоусіна (камандуючы войскамі Манчжоу-Го ва Унутранай Манголіі), заняўшыя Чжанбэй, у сучасны момант «трымаюць у сваіх руках 9/10 усёй правінцыі Чахар». Карэспандэнт сцвярджае, што «кітайскі ўплыў у Чахары ўжо фактычна зведзен на нішто».

Прасоўванне кітайскай чырвонай арміі

ЛОНДАН, 7 студзеня. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтар з Ханькоу, кітайская чырвоная армія колькасцю каля 20 тыс. байцоў пад камандаваннем Хо Луна, прайшоўшы праз Юньчжоу (заходняя частка правінцыі Хунань), уступіла ў правінцыю Гуйчжоу і накіроўваецца насустрач часцям кітайскай чырвонай арміі Чжуде, якія знаходзяцца ў заходняй частцы правінцыі Сычуань. Для аперацый супроць Хо Луна перакідваюцца хунаньскія, гуйчжоўскія і гуаньсійскія войскі.

Усеагульная забастоўка ў Буэнос-Айрэсе

НЬЮ-ІОРК, 7 студзеня. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва «Асашыэйтэд прэс» з Буэнос-Айрэса (Аргентына), там пачалася 24-гадзінная ўсеагульная забастоўка салідарнасці рабочых важнейшых галін прамысловасці з 20 тысячамі будаўнічых рабочых, якія бастуюць 2,5 месяца і патрабуюць павышэння заработнай платы.

У сутычках паміж бастуючымі і паліцыяй адзін рабочы і трое паліцэйскіх забіты. Многа рабочых ранена. Бастуючыя, дабіваючыся спынення руху ў горадзе, спалілі некалькі аўтобусаў і трамвайных вагонаў. У раёнах забастоўкі патруліруюць войскі.

ДЗЯРЖАЎНЫ БЮДЖЭТ ЗША

ЛІКВІДАЦЫЯ ДЭФІЦЫТУ ЗА КОШТ БЕСПРАЦОЎНЫХ

ВАШЫНГТОН, 6 студзеня. (БЕЛТА). Прэзідэнт Рузвельт унёс у кангрэс (парламент ЗША) праект бюджэту на 1936—1937 бюджэтны год. Бюджэт збалансаваны шляхам адхілення ўсіх асігнаванняў на аказанне дапамогі беспрацоўным. У пасланні кангрэсу Рузвельт указвае, што адхіленне асігнаванняў на аказанне дапамогі беспрацоўным зроблена з прычыны немагчымасці ў сучасны момант вылічыць сумы, неабходныя для задавальнення патраб беспрацоўных.

Даходная частка праекту бюджэту вылічана ў суме 5 мільярдаў 654 мільёны даларaў, а расходная частка — 5 мільярдаў. Агульная сума нацыянальнага доўгу ў 1937 годзе дасягне 31 мільярда даларaў, не лічачы дадатковага дэфіцыту, выкліканага расходамі на аказанне дапамогі беспрацоўным. Праект бюджэту прадугледжвае асігнаванне 1 мільярда даларaў на армію, флот і авіацыю. Буйныя дадатковыя ваенныя расходы ўключаны ў розныя праграмы грамадскіх работ.

***

ВАШЫНГТОН, 7 студзеня. (БЕЛТА). Пасланне Рузвельта аб бюджэце прадугледжвае самыя буйныя ваенныя асігнаванні ў гісторыі ЗША ў мірны час. Марскаму міністэрству асігнавана 568 мільёнаў даларaў супроць 425 млн. у бягучым годзе, ваеннаму—370 млн. даларaў супроць 319. Для асігнаванняў на армію і флот могуць быць таксама скарыстаны буйны фонд грамадскіх работ і іншыя, так што агульны памер ваенных асігнаванняў намнога перавышае 1 мільярд даларaў.

МОРСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў ЛОНДАНЕ

ЛОНДАН, 7 студзеня. Учора адбылася ваенна-морская канферэнцыя ў Лондане. У сувязі з адстаўкай Хора, старшынствавушага на канферэнцыі, старшынёй абран Ідэн.

***

ТОКІО, 6 студзеня. Па словах газеты «Ніці-ніці», у японскіх марскіх колах лічаць, што «некалькі дзён работы лонданскай морскай канферэнцыі будзе дастаткова для таго, каб зразумець, што няма ніякіх надзей на заключэнне новага морскага пагаднення». У японскіх марскіх колах таму лічаць, што ўдзельнікі канферэнцыі, відаць, займуцца вышукваннем спосаба закрыцця канферэнцыі.

«ВАЛЮТНАЯ АПЕРАЦЫЯ» ФАШЫСЦКІХ ПАГРОМШЧЫКАЎ

ПАРЫЖ, 6 студзеня. Газета «Эвр» паведамляе, што германскі ўрад намячае новае мерапрыемства з мэтай «вырашэння пытання аб яўрэях». Мяркуецца масавае высяленне за граніцу каля 100 тысяч яўрэяў, пражываючых у Германіі.

Выдаткі ўрада па перасяленню яўрэяў павінны быць аплачаны яўрэйскімі абшчынамі Лондана і Н'ю-Іорка. Германскі ўрад атрымае такім чынам значную суму ў замежнай валюце, якая будзе выкарыстана для фінансавання германскага экспарту.

ГОРАД ГАЛЕЧЫ

ВАРШАВА, 4 студзеня. (БЕЛТА). Пад загалоўкам «Горад галечы» журнал «Тыждзень работніка» змяшчае заметку аб горадзе Остраве ў Польшчы. У горадзе велізарная колькасць беспрацоўных. Беспрацоўныя маюць мізэрныя грошы праз добрачынное таварыства атрымаць адзін раз у месяц работу, за што атрымліваюць пэўную колькасць вугалю горшага сорту. У мясцовай добрачыннай кухні беспрацоўныя атрымліваюць пракісшыя супы. Бульбу для гэтай кухні чысцяць жоны беспрацоўных. За сваю працу з 7 гадзін раніцы да 7 гадзін вечара яны атрымліваюць таксама вугаль. Затое беспрацоўных часта частуюць пропаведзямі з каталіцкай місіі.

ВЯЛІКАЯ ПАВОДКА ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 6 студзеня. (БЕЛТА). Па ўсёй Францыі адбываюцца вялікія паводкі. На велізарнай працяжнасці заліты палі, вінаградніки, лугі. Чыгуначныя зносіны Парыж—Бардо, Парыж—Нант спынены. Паязды ходзяць у абход. Зносіны па шашы ў ваколіцах Бардо і Нанта прарваны. Ля Нанта вада ў Луары па-ранейшаму прыбывае і з'явілася ўжо ў пэнтры горада. Страты мільённыя. Работа на многіх верфях і заводах спынена. Апасаюцца эпідэміі з прычыны таго, што каналізацыйныя воды хлынулі назад — у горад.

„ПЕРАБУДОВА" ПАЛКОУНІКА дэ ля РОКА

Парыж... Поўдзень. Ажыўлены Севастопальскі бульвар. Сярод прахожых прабіраецца малады чалавек у блузе поўваеннага пакрою і ў блакітным берэце. Даволі зірнуць на спітую фізіяномію маладога чалавека, на яго спецыфічную паходку, пазычаную ў апашэй, каб зразумець, што гэта «камло дэ руа» — каралеўскі малойчык (фашыст).

Калі-б па бульвару ішоў дзесятак камло, прахожыя без сумнення спалохана шарахаліся-б у бок, чакаючы скандалу, бойкі ці правакацыйнага нападу. Але зараз камло адзін. Таму на яго глядзяць з пагардлівай цікаўнасцю. У руках у камло вядзёрка і пэндзель, а пад пахай скрутак нейкіх аб'яў. Камло спыняецца каля афішнага слупа, апускае пэндзель у вядзёрка, прыклейвае стракатую афішу і ўдаляецца.

На афішы велізарнымі літарамі выведзена:

— Мы абвінавачваем палкоўніка дэ ля Рока (кіраўніка фашысцкай арганізацыі «Баявыя крыжы»). Далей дробнымі літарамі следуе матывіроўка абвінавачання. Граф дэ ля Рок, аказваецца, «ганебна здрадзіў французскаму нацыянальнаму руху». Ён здрадзіў фашысцкім лігам, выказаўшы ў палаце дэпутатаў гатоўнасць раззброіцца. Вуснамі дэпутата Ібернегарэ ён абяцаў «спыніць сваркі» і перакаваць скорастрэльныя карабіны і аўтаматычныя вінтоўкі ў... спартыўныя прылады. Яго падручныя не будуць больш падсцерагаць міністраў-радыкалаў, не будуць страляць па абязбройных рабочых. Эрло перастануць пагражаць павешаннем на ліхтарным слупе ў Венсенскім лесе спыняцца практыкаванні ў стральбе па рухомых мішэнях.

З гэтым ніяк не могуць прымірыцца ні «каралеўскія малойчыкі», ні «патрыятычная моладзь». І Тетэнжэ, французскі Пуришкевіч, той самы, што пад свіст і ўлюлюканне дэпутатаў абяцаў расправіцца з палатай, адмяжоўваецца ад графа дэ ля Рока, кляйміць яго здраднікам, намякае, што ён «прадаўся марксістам», пагражае, што «ні адзін прыстойны француз не падасць рукі таму, хто ў крытычны момант ганебна струсіў».

У асяроддзі ўзначальваемых дэ ля Рокам «Баявых крыжоў» нечаканае рашэнне «правадыра» выклікала немалы разброд. Некаторыя бліжэйшыя саратнікі графа дэ ля Рока згарача выступілі з арганізацыі, аддаўшы анафеме ўчарайшага «ратавальніка». «Мы сталі афярай здрады» — усклікнуў Ксав'е Валло, наперснік дэ ля Рока.

Сярод усёй гэтай свістапляскі дэ ля Рок хаваў неабгрунтаванае маўчанне. Ён ведаў, што робіць. Урэшце-ж грашыма распараджаўся ён, а не хто іншы. Ён, а не хто-небудзь іншы, атрымліваў дырэктывы каралёў біржы, магнатаў капітала. І калі граф дэ ля Рок палічыў патрэбным зрабіць іменна так, а не інакш, дык адчытваецца ў сваіх дзеяннях яму прыдзеецца зусім не перад членамі лігі, а перад сапраўднымі сваімі гаспадарамі. Тым «барынам», які рассудзіць дэ ля Рока з «захавальнікамі чыстаты» французскага фашызма, з'яўляецца манапалістычны капітал, які разглядае лігі, як свае ўдарныя атрады, як сродкі для знішчэння астаткаў дэмакратычных свабод, для тэрору супроць рабочых, разгрому рэвалюцыйных арганізацый.

«Барын» рашыў, што даны момант не падыходзіць для лабавой атакі. Настроі народных мас рэзка варожыя фашыстам. А гэта выклікае неабходнасць манеўравання.

Было-б бязглуздзіцай меркаваць, што граф дэ ля Рок адмовіўся ад сваіх мэт, што фашысцкія лігі добраахвотна раззбройваюцца. Прынятыя палатай законы аб фашысцкіх лігах не забяспечваюць спынення злачыннай дзейнасці французскіх фашыстаў.

Разброд і супярэчнасці ў асяроддзі радыкалаў, палавінчатая тактыка соцыялістаў прывялі да таго, што законам, якія па замыслу свайму павінны былі абрушыцца на фашыстаў, надзен «эластычны» (гумовы) характар. Яны, уласна кажучы, нікога не абавязваюць. Усё залежыць ад талкавання. Трапілі-б яны ў рукі «каментатараў» з рэакцыйнага лагеру — і рэпрэсіі, накіраваныя супроць «поўваенных арганізацый», маглі-б пазбавіць народны фронт неабходных мер самаабароны. Натуральна, гэтыя законы аб фашысцкіх лігах не могуць задаволіць найшырэйшыя народныя масы, якія ненавідзяць фашызм і гатовы да барацьбы з ім.

Дэ ля Рок аддаў загад: ператварыць «Баявыя крыжы» ў спартыўнае таварыства. Гэты загад выклікаў абурэнне ў найбольш тупых і прамалінейных паслядоўцаў кандыдата ў французскія Гітлеры. Больш хітрыя зразумелі, што гутарка ідзе аб часовым манеўры. Па сутнасці «Баявыя крыжы» захавалі сваю ваенную струк туру. Арганізацыя, парадкі, узаемаадносіны, нарэшце, задачы засталіся ранейшымі. І калі графскім штурмавікам давялося перафарбавацца ў хакеістаў і веласіпедыстаў, то зроблена гэта зусім не ў імя квітнення спорту бацькаўшчыны. Бо кожнаму ясна, што зручней збірацца ў поле, маршираваць, захаваць старыя навыкі пад спартыўнай шыльдай, чым, скажам, пад сцягам гурткоў прыхільнікаў прыгожай славеснасці, ці аматараў харавога спявання.

Што-ж датычыць практыкаванняў у стральбе, вопытна-паказальных штыхавых і шабельных атак, дык усё гэта не абавязкова рабіць у Венсене пад Парыжам. Для гэтага існуюць памешчыкіх маёнткі, старынныя і паэтычныя замкі ў Брэтані, Нармандыі і Пікардыі. К таму-ж дакрэт аб нашэнні зброі не пашыраецца на былых афіцэраў і унцер-афіцэраў. А хто не ведае, што атрады дэ ля Рока на дзве трэці складаюцца іменна з адстаўных унцераў?..

«Дэ ля Рок разумней за многіх сваіх сяброў і канкурэнтаў з уласнага лагеру,— піша венская «Нейе Фрэйе прэссе». Зрабіўшы сапраўды французскі жэст, ён прапанаваў леваму лагеру нешта накшталт перамір'я. Але перамір'е не прымушае яго скласці зброю. Ён захоўвае сваю армію і свабоду дзеяння ў далейшым».

Гэта «свабода дзеяння» прадастаўляецца дэ ля Року, як узброенае выступленне супроць народнага фронта, супроць рабочых у той момант, калі банкі і біржа палічаць момант падыходзячым. Але.. зараз не час. Суадносіны сіл у краіне яўна невыгодны для французскага фашызма. Журнал «Вю» не так даўно апублікаваў карту размеркавання сіл народнага фронта і фашысцкіх ліг. Беглага погляду даволі, каб зразумець, якой магутнай перавагай уладае народны фронт: «Як толькі раздасца кліч, рабочыя, сяляне, дробны прапоўны люд прыдуць пеша, каб грудзьмі стаць супроць фашызма» — піша «Вю». Зараз не час. І дэ ля Рок імкнецца выйграць час, замятае сляды, распускае чуткі аб тым, што ён «схілен прымірыцца з парламентарызмам» («Журналь»).

«Эко дэ Пары» заступаецца за графа і рэкамендуе яго, як добрага распубліканца. Якія доказы патрэбны: — пытае газета. На сходах «Баявых крыжоў» выконваюць марсельезу. Хіба гэтага недастаткова для рэабілітацыі?

Хіба не сведчыць гэта аб кротасці і смірэнні ліг?

Дэ ля Рок ужо заявіў, што пяперашнія спрэчкі ў лагеры фашызма паслужаць повадам да «чысткі» ліг ад «няўстойлівых» элементаў. Ён патрабуе бясспрэчнага паслухмянства. «Дайце мне дзейнічаць так, як гэта выклікаецца неабходнасцю».

Неабходнасць выклікала некаторую тактычную перагрупоўку, але пад лічынай нацыянальнага прымірэння захаваліся тыя-ж воўчыя клыкі, тыя-ж разбойнічыя фашысцкія павадкі. «Баявыя крыжы» злалі ўладам некалькі ржавых пісталетаў. А як з шматлікімі складамі навейшай зброі? «Дэ ля Рок трымае нож напагатове, каб папрабаваць увагнаць яго ў спіну рабочага класа, калі ён палічыць гэта зручным» — чытаем мы ў «Юманітэ».

Французскі народ ні на мінуту не верыць мірным запэўненням фашызма. Атрымаўшы першыя значныя поспехі ў барацьбе з фашызмам, ён не спыніцца на поўдарозе. Ён расцісне фашысцкую гадзіну, якая рыхтуецца зноў вынаўзці са сваёй нары.

Б. ЛЬВОЎ.

СТАХАНАЎСКІ РУХ СУСТРАКАЕ ПЕРАШКОДЫ

(ПІСЬМО РАБОЧАГА)

Я, брыгадзір змены нова-апаратурнага аддзялення шклоўскай паняровай фабрыкі «Спартак», узяў на сябе абавязак працаваць на двух варштатах замест аднаго і навялічыць кады на 40 метраў у мінуту. Але загадчык цэха тав. Алейнікаў у гэтым мне катэгарычна адмовіў. Толькі дзякуючы маёй настойлівасці праз паўтара месяца нам на двух далі адзін лішні варштат.

Наогул адміністрацыя яшчэ не зразумела сутнасці стаханаўскага руху. Каб падагнаць план выпуску прадукцыі, Алейнікаў прызначае работы на выходныя дні, але пры гэтым не забяспечвае дапаможным матэрыялам.

Так было 30 лістапада, калі адсутнічалі змазачнае масла, анучы і кольцы для намоткі бабін. У выніку змена палавіну дня прастаяла без працы. Так было і 20 снежня, калі перад выходным днём Алейнікаў не забяспечыў цэх анучамі. Дзякуючы гэтаму ўборка была зроблена адной брудной анучай.

Дырэктар фабрыкі заўважыў, што ўборка зроблена дрэнна, і адлаў загад зняць Алейнікава з работы. Але па калайніцтву Алейнікава дырэктар адмяніў свой загад, а вінаватым незаслужана прызнаў мяне і вызваліў ад абавязкаў брыгадзіра.

А. КІМСТАЧ.

НЕДАБУДАВАЛІ

(ПІСЬМО НАСТАЎНІЦЫ)

На пабудову школы ў вёсцы Галавачах, Прыборскага сельсавета (Рагачоўскі раён), было выдаткавана 22 тысячы рублёў. Будаўніцтва школы па пастанове прэзідыума раённага выканаўчага камітэта павінна было закончыцца да пачатку заняткаў. На яго заканчэнне па бюджэту сельсовета адпушчана 2.500 руб.

Але сельсавет вызначаных грошай не скарыстаў. І школа да гэтага часу не прыстасавана да заняткаў. Пабудаваны толькі два класы, ды і тыя без пячэй. Падвойных рам няма. Дзеці на занятках сядзяць у верхняй вопратцы.

У адным класе ўжо абвалілася атынкоўка і працякае столь. Таму прышлося адтуль выбрацца і праводзіць заняткі ў другую змену.

ГАЎРЫЛЬКОЎ.

АГІДНАЯ СПРАВА

Антось Пракапеня—жыхар вёскі Пятрылава, Пукаўскага сельсовета, Гроскага раёна. У мінулым батрак, сірата. Да ўступлення ў калгас быў беспрытульным.

Вясной 1935 года Антось уступіў у калгас «Новая зара», гаго-ж сельсовета, дзе ён знайшоў прытулак і сустрэў добрыя адносіны калгаснікаў. Антось з ахвотай узяўся за работу. Усе хвалілі яго і гаварылі, што з Антося будзе добры працаўнік.

Жыўшыя радам з калгасам кулакі Сакалоўскія, матка і сын шукалі шчыліну, праз якую можна было-б пралезці, каб пашкодзіць калгасу, каб унесці разлад у калгасную сям'ю.

Для сваёй шкоднай мэты яны і скарысталі малаграматнага, адсталага Антося Пракапеню, які ўсяго поўгода працуе ў калгасе.

Кулакі падбухторылі Антося, каб ён зрабіў пакражу ў брыгадзіра першай брыгады Пыка Алеся. Антось паддаўся ўплыву кулакоў Сакалоўскіх і ўкраў у Пыка рукавіцы і ножык.

Зразумела, учынак Антося Пракапені заслугоўвае самага рэзкага асуджэння і грамадскага ганьбавання. Для гэтага ў калгасе ёсць таварыскі, грамадскі суд, які павінен быў разабраць гэту справу. Трэба падаць, што да такіх адсталых людзей, як Алесь Пракапеня павінен быць асаблівы падыход. Іх трэба цярпліва перавыхоўваць.

Што-ж зрабілі брыгадзір Пыка і намеснік старшыні калгаса Бурак і конюх Аляксандр Пракапеня? Яны прымянілі да яго самы дзікі, варварскі самасуд.

Гэта група сустрэўшы Антося на калгасным двары, патрэбавала, каб ён прызнаўся ў пакражы. Калі Пракапеня адмовіўся, яны схапілі яго і прывязалі лейцамі да слупа, і сталі пагражаць далейшай расправай. Больш гадзіны стаяў Антось прывязаны, ніякія просьбы не дапамагалі. У справу ўмяшалася калгасніца Волька Гурбановіч, якая набралася смеласці і наперакор злачынцам адвязала Антося. Але яны на гэтым не супакоіліся. Брыгадзір Пыка схапіў Антося Пракапеню і зноў звязаў яго. Канец вяроўкі ён прывязаў да хваста каня і пачаў ганяць апошняга па двару. Антось звязаны валачыўся за канем. Толькі калі абегліся калгаснікі, злачынцы кінулі сваю афяру.

Праўленне калгаса (старшыня Давыдоўскі) і сельсавет (старшыня Сілковіч) палічылі гэту справу малаважнай і не прынялі ніякіх мер супроць злачынцаў.

Раённыя арганізацыі, у прыватнасці пракуратура, таксама не надалі адпаведнага значэння гэтай справе. Толькі пасля таго, як умяшалася рэдакцыя «Звязды», злачынцы былі арыштаваны.

Гэтымі днямі справа гэта будзе слухацца ў калгасе паказальным парадкам. Трэба спадзявацца, што пролетарскі суд вынясе суровае пакаранне кулакам-падбухторшчыкам і іх агентам.

А. ПАНЬКОЎ.

ПАМЫЛКІ брыгадзіра

У часе прапраноўкі прамовы таварыша Сталіна калгас «Труд», Хойніцкага раёна у сваім рашэнні запісаў: дабіцца ў 1936 годзе ўраджаю бульбы з кожнага гектара не менш 250 цэнтнераў.

У 1935 годзе з кожнага гектара калгас атрымаў 185 цэнтнераў бульбы. Ураджай гэты ніядрэнны. Але калгас дапусціў памылкі, якія значна знізілі яго ўраджай.

Вось што расказвае калгасны брыгадзір тав. Салаўёў аб сваіх памылках:

— Летам калі зацвіла бульба, я заўважыў, што бульбоўнік не закрывае баразён. У часе пасадкі бульбы паасобныя калгаснікі ў пагоні за колькасцю ігнаравалі якасць і аралі плугам некалькі шырэй, чым трэба. На гэта я тады не звярнуў увагі. У выніку рады атрымаліся адзін ад другога на адлегласці 70 сантыметраў. І палоскі паміж радамі ў 10—12 сантыметраў не давалі ніякай карысці, яны пуставалі. Ад гэтага мы страцілі 110—120 пудоў на кожны гектар.

Па булучы год гэтых памылак не дапусцім.

Далей тав. Салаўёў пераходзіць да пасадкі бульбы.

— Не ўсе калгаснікі старанна выконваюць сваю работу. Бываюць вельмі часта выпадкі, калі бульбу не саджаюць, а проста кідаюць у баразны. Ад гэтага 15—20 проц. бульбы расце не на сваёй плошчы, яна расце ці вельмі густа, ці вельмі рэдка. У выніку гэтага ад няправільнай пасадкі калгас страціў не менш 80 пудоў на гектары.

Тав. Салаўёў упэўнена заяўляе, што ў іх калгасе, дый не толькі ў іх, а ў большасці калгасаў, якія ён ведае ў раёне, на кожныя 100 пасеяных клубняў 8—10 не ўсходзяць, застаюцца пляшы. Гэта бывае ад таго, што ў пасеўным матэрыяле трапляюцца вельмі дробныя клубні, якія часта не ўсходзяць, трапляюцца папсаваныя, а частка клубняў раздушваецца коньмі ў часе пасадкі. З гэтай прычыны калгас таксама недаатрымаў пудоў 110—120 на кожны гектар.

У часе акучвання на кожныя 100 раслін дзве-тры засыпаюцца зямлёй і такая-ж колькасць зусім вырываецца і тут калгас недаатрымаў пудоў 40—50 бульбы на кожны гектар.

Пытанне аб памылках, якія закрануў тав. Салаўёў, выклікала вялікую зацікаўленасць сярод калгаснікаў, яны дапоўнілі брыгадзіра.

— Я заўважыў — кажа калгаснік тав. Рабы, — што ўраджай бульбы атрымліваецца на 20 проц. большы, калі поле ўзорваецца першы раз сантыметраў на 7—10 глыбей у параўнанні з тым, як яно ўзорваецца пры пасадцы. Пры такім метадзе ворыва ў часе пасадкі астаецца мяккі пласт глебы ў 8—10 сантыметраў.

Ад гэтага мы таксама трацілі на кожным гектары.

Ад няроўнамернага размеркавання гною і дрэннага заворвання яго калгас траціў процантаў шэсць ураджаю.

У калгасе «Труд» ёсць два гатункі бульбы: «Вольтман» і мясцовы гатунак пад назвай «сараковачка». Абодва гэтыя гатункі змешаны. Ураджайнасць «сараковачкі» меншая процантаў на 50. Але, не гледзячы на гэта, горшы гатунак займаў немалую плошчу сярод «Вольтмана» — не менш 30 процантаў. Па гэтай прычыне ўраджай знізіўся пудоў на 150 на кожным гектары. Гэта памылка ўжо выпраўлена. Яшчэ з восені калгаснікі перабралі насенную бульбу і пакінулі толькі «Вольтман».

Па падліках брыгадзіра Салаўёва ад памылак, якія былі дапушчаны ў калгаснай вытворчасці, яны недаатрымалі каля 1000 пудоў бульбы на кожны гектар.

Зусім праў тав. Салаўёў, калі ён кажа, што перш за ўсё гэта памылкі брыгадзіра. Гэта памылкі вельмі многіх нашых калгасаў. У адных яны меншыя, у другіх большыя. Кожны брыгадзір, кожны старшыня калгаса, які ставіць перад сабой задачу павышэння ўраджайнасці, перш за ўсё павінен падлічыць дапушчаныя ў мінулым годзе страты, вывучыць іх прычыны, каб не дапусціць іх паўтарэння.

Т. ШАРШНЕЎ.

ГУКАВОЕ КІНО БЕЗ ЭЛЕКТРЫЧНАГА СВЯТЛА

У Клічаўскім кінатэатры заканчваецца ўстаноўка апаратуры для гукавога кіно, але ніхто ў Клічаве не прыздумаецца над тым, адкуль узяць электраэнергію. Між тым у млыне райкамбіната і лазні ўстаноўлены лакамобілі, якія поўнасцю не выкарыстоўваюцца. Упаўне тут можна ўстанавіць дынамамашыну, якая дала-б электраэнергію для асвятлення мястэчка Пяма ў Клічаве і гасцініцы, але райвыканком аб гэтым мала дбае.

Я. НОВІКАЎ.

Група беларускай дэлегацыі на выстаўку па ільну ў г. Кепінін. На здымку (злева направа) — першы ряд: Паўлючэнка, Разуські, Кароўнікаў і Кенляева. Другі ряд: Ялавік, Кругенаў, Серафімава, Шустраў.
Фото КАПЛІНСКАГА.

ЗА 7—8 МІЛЬЯРДАЎ ПУДОЎ ХЛЕБА

РАЕННЫЯ ЗЛЕТЫ стаханаўцаў палёў

БЕШАНКОВІЧЫ. (Спец. кар. «Звязды»). Мястэчка тоне ў шматлікіх чырвоных сцяжках, партрэтах правадыроў партыі і ўрада, любоўна ўпрыгожаных зеленню. Вялікія яркія лозунгі вітаюць удзельнікаў першага раённага злёта стаханаўцаў сельскай гаспадаркі.

Злёт адкрывае сакратар райкома партыі тав. Асадчы. Месцы ў прэзідыуме разам з членамі бюро райкома і прэзідыума райвыканкома займаюць праслаўленыя на ўвесь раён стаханаўка-трапальшчыца Ніна Зубец, Фядора Зубец, дэлегат другога ўсесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў тав. Толстая, член ЦВК БССР тав. Гараліна, старшыня перадавога ў раёне калгаса «Чырвоны Кастрычнік» тав. Дуброў і іншыя.

У парадку дня адно пытанне — распрацоўка пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) «Аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў і ўадыме сельскай гаспадаркі ў абласцях, краях і рэспубліках вячорназемнай паласы».

Ледзь прамоўца кончыў гаварыць, як у зале раздаліся гарачыя апладысменты ў гонар з'явіўшайся лёзнянскай дэлегацыі ў складзе знатных людзей Лёзняншчыны і БССР тт. Пярцовай, Быкоўскай і Кавалёвай.

Тав. Пярцова на трыбуне. Яркая прамова, вярней, нават не прамова, а лекцыя, гэтай праславіўшайся па ўсёй БССР стаханаўкі была наскрозь прасякнута канкрэтнай праграмай барацьбы за далейшае павышэнне ўраджайнасці нашых социялістычных палёў, за большэвіцкую рэалізацыю пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б).

Прамова т. Пярцовай была пакрыта гарачымі апладысментамі. Злёт прэміруе яе бюстам Леніна. Ударніца калгаса імя Леніна т. Варанько падносіць ёй букет кветак. Бюст Леніна і кветкі былі таксама паднесены тт. Быкоўскай і Кавалёвай.

Да трыбуны падыходзіць першы ініцыятар разгортвання стаханаўскага руху ў Бешанковіцкім раёне, трапальшчыца Ніна Зубец. Вітаючы лёзнянскую дэлегацыю, т. Зубец у адказ на пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б), бярэ на сябе абавязацельства змагацца за пашырэнне стаханаўскіх метадаў работы ў раёне, за атрыманне з гектара не менш 5 цэнтнераў ільновалакна.

Ніну Зубец змяняе загадчык узорнай свінагадоўчай фермай калгаса «Палітаддзелец» тав. Умецкі. У гэтым годзе ад 18 матак атрымана 286 парасят замест прадугледжаных планам 120. Ферма не ведае адыходу свіней. Сярэдні апарос свінаматкі складае 18,5 парасят. За 1935 год ферма атрымала чыстага прыбытку каля 10 тыс. руб. У 1936 годзе тав. Умецкі абяцае паставіць работу фермы так, каб мець магчымасць выдаваць калгаснікам на прападні свіное мяса.

Рэзалюцыі не прымалі. Замест яе ўдзельнікі злёта заключылі з Лёзнянскім раёнам социялістычны догавор на лепшую рэалізацыю пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б), за атрыманне ў 1936 годзе ўраджаю з гектара зернавых 100 пудоў, ільну 5 цэнтнераў і бульбы 1.100 пудоў. Ад Лёзнянскага раёна социялістычны дагавор падпісалі таварышы Пярцова, Быкоўская, Кавалёва, ад Бешанковіцкага — Зубец Ніна, Гараніна, і Талстая.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

* * *

СЛУЦК. (Кар. «Звязды»). Слуцкі акруговы камітэт партыі праводзіць падрыхтоўку да акруговай нарады стаханаўцаў перадавікоў ураджаю на зярну, трактарыстаў, машыністаў малатарань і выдатнікаў жывёлагадоўлі. Зараз праходзяць раённыя нарады. 1 студзеня нарада адбылася ў Капыльскім раёне.

Удзельнікі нарады прынялі рад канкрэтных абавязацельстваў і звярнуліся з пісьмом да ўсіх калгасаў акругі разгарнуць социялістычнае спаборніцтва за дасягненне ў 1936 годзе ўраджайнасці зернавых у сярэднім 22 цэнтнеры з гектара, бульбы не менш 300 цэнтнераў з гектара, ільну не менш 6,5 цэнтнераў.

2 студзеня адбылася нарада ў Любаньскім раёне. Акруговая нарада адбудзецца 19 студзеня. У парадку падрыхтоўкі да гэтай нарады ў калгасах узмоцнена рыхтуюцца да веснавой сяўбы. Калгас «Ударнік», Любаньскага раёна, зрабіў пробны выезд у поле. Выезд паказаў поўную гатоўнасць да сяўбы.

СКУЦЗЯНЯ.

Яравізацыя павысіла ўраджай

Вясной у калгасе «Пролетарый», Жыткавіцкага раёна, быў зроблен дослед па яравізацыі пшаніцы. Узялі сорт «пэзіум 0,111». Яравізацыю пачалі 4 красавіка і скончылі 10-га. Перад яравізацыяй пшаніца была пратручана сухім спосабам—парашком «АБ». Пасеў зрабілі радковай сеялкай на плошчы ў 0,675 гектара. Норма высеву была з разліку 160 кілограмаў на гектар. У тойжа дзень на такой-жа плошчы такім-жа спосабам была пасеяна пшаніца неяравізаваная. Сяўба праводзілася на зазямленым участку, папярэднік—азімае жыта. 20 красавіка з'явіліся дружныя ўсходы.

1 чэрвеня было праведзена параўнанне абодвых участкаў. Яравізаваная пшаніца мела 40 сантыметраў росту, неяравізаваная — 35. Яравізаваная паспела на тры дні раней і дала з гектара 11,8 цэнтнера, неяравізаваная дала 9,5 цэнтнера. Такім чынам, розніца ў 2,3 цэнтнера на гектар атрымалася выключна за кошт яравізацыі.

Брыгадзір-палявод САУЧЫЦ.

Звяно М. Я. Рагоўскай

Стаханаўка ільноапрапоўкі калгаса імя Тімірязева, Сенненскага раёна, **Марыя Якаўлеўна Рагоўская** арганізавала ў сваім калгасе ільнаводчае звяно з пяці лепшых ударніц. За звяном замацаван участак зямлі ў 5 гектараў — канюшынішча. Гэты ўчастак заазблен. Ільнонасенне засыпана, ачышчана і праверана на ўсходжасць. Звяно абавязалася ў гэтым годзе атрымаць з гектара 7 цэнтнераў валакна 14—16 нумарам.

— За 7 цэнтнераў валакна, — кажа т. Рагоўская, — будзем змагацца ранняй сяўбой на добра апрацаванай і ўгноенай глебе, чыстагатункавым насеннем, своечасовай і добраякаснай праполкай, клапатлівым доглядам ільну на ўсіх працэсах, пачынаючы ад сяўбы і канчаючы апрацоўкай. За зімовы час мы ўсе члены звяна будзем вывучаць агратэхніку.

Па прыкладу Рагоўскай звяно з 4 чалавек арганізавалася ў калгасе «Індустрыя», якое таксама разгарнула барацьбу за 7 цэнтнераў валакна з гектара не ніжэй 14 нумарам. У калгасе «Перамога» арганізавана комсамольска-маладзёжнае звяно. Ва ўсіх звенях разгарнулася агравучоба.

А. МАХНАЧ.

З АПОШНЯЙ ОШТЫ

Бязглуздзіца

«...Бяспалаў Ягор—мужчына каранасты, немалады і не так ужо каб стары. Чалавек у поўнай сіле. Зараз — калгаснік сельскагаспадарчай арцелі «Большэвік». Вось кароткая характарыстыка чалавека-нягодніка».

Такія прыёмы характарыстыкі, якімі карыстаецца на сваіх старонках хопімская раённая газета «Калгасная звязда». Атрымлівацца, што дастаткова быць каранастым і з'яўляцца калгаснікам калгаса «Большэвік», каб трапіць у нягоднікі. Безумоўна, што Бяспалаў, які агідна аднёсся да сваёй жонкі,—нягоднік, але-ж нельга на гэтай падставе пісаць бязглуздзіцу.

У запале

Не раз у цэнтральным друку ўказвалася на недапушчальнасць механічна пераносіць стаханаўскія метады ў тыя ці іншыя галіны работы. Між тым орган канаткавіцкага райкома КП(б)Б і райвыканкома «Большэвік» вынайшоў стаханаўцаў... вучобы. З гэтага поваду газета змясціла пісьмо вучняў другога класа Капаткевіцкай сярэдняй школы, ды яшчэ пад такім гучным загалоўкам: «Не толькі работаць, але і вучыцца па-стаханаўску». Раім часова выконваючаму абавязкі рэдактара тав. Мажайскаму тэрмінова даць тэлеграму Народнаму камісарыяту асветы: «Дзеці абвясцілі сябе стаханаўцамі, паведамце, што рабіць».

Навіны ў Дуброўне

Дуброўенская раённая газета «За социялістычнае будаўніцтва» ў нумары ад 4 студзеня паведаміла:

«Учора, 3 студзеня, у наш раён прыляцелі два самалёты эскадрыльі імя Максіма Горкага. На самалёце прыбылі — нарком мясцовай прамысловасці БССР тав. Пуціло, пілоты тт. Дзёмін і Мураўёў...» і т. д.

Да гэтага часу было вядома, што наркомам мясцовай прамысловасці БССР з'яўляецца тав. Балцін. Дзякуем таварышоў з дуброўенскай газеты за новае паведамленне.

Нізкая якасць будматэрыялаў

На ўсесаюзнай нарадзе пры ЦК ВКП(б) па пытаннях будаўніцтва вялікая ўвага была ўдзелена якасці будаўнічых матэрыялаў. Для таго, каб забяспечыць высокую якасць будаўніцтва, неабходна, каб будоўлям давалі і высокай якасці будматэрыялы. Між тым іменна якасць будматэрыялаў на радзе менскіх заводаў вельмі нізкая. Аб гэтым сігналізуюць нядаўна створаныя бракеражныя камісіі на будоўлях.

Менскі завод імя Молатава (дырэктар т. **Карасік**) выпускае спажывецкі лесаматэрыял з павышанай вільготнасцю на 25—30 проц. Гэта спрыяе развіццю хатняга грыбка і намнога скарачае тэрмін службы драўніны.

Дрэннай якасці выпускае чарапіцу менскі чарапічны завод (дырэктар т. **Асінскі**). Дастаўленая на будаўнічую пляцоўку менскай гасцініцы чарапіца мела 20—25 проц. трэшчын і да ўкладкі аказалася зусім непрыгоднай. Апрача таго, чарапіца мела розныя размеры, што таксама не давала магчымасці пакрываць дах.

Войлачны завод (дырэктар т. **Шмулевіч**) даставіў на гэту-ж пляцоўку нізкай якасці войлак. Ён быў з асобных кавалкаў, не звязаных у лісты і таму нельга было ўжыць для абіўкі дзверных і акопных каробак.

Дрэннай якасці выпускае пэглу завод № 1—3 (дырэктар т. **Альховік**). 70 проц. прадукцыі — брак.

Такое становішча з якасцю будматэрыялаў зусім неярпіма.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН

ЕФІМАЎ—ЧАЛАВЕК КУЛЬТУРНЫ

У лазні панаваў шум вады і вясёлы жаночы гоман. Гэта мылася жанчыны соўгаса Загараны. Яно можа нічога дрэннага з гэтага і не было-б: неўзабаве вышлі-б яны распараныя, ружовыя і вясёлыя, мы павіншавалі-б іх з лёгкай парай і разам парадаваліся-б чыстаму і культурнаму жыццю соўгаса Загараны. Але гэтаму не суджана было здарыцца і пара для жанчын вышла-б не вельмі лёгкая.

Справа ў тым, што якраз у гэты момант засвярбела пад пахамі ў дырэктара соўгаса Ефімава. Ефімаў-жа чалавек культурны, ён ведае: калі свярбіць пад пахамі, то трэба ісці ў лазню: «Як-жа ён пойдзе, калі там жанчыны?»—падумае чытач. Вось і мы так думалі. Але-ж Ефімаў, чалавек культурны, хіба ён можа думаць? Цяжкасцей ён таксама не баіцца. Адным словам, праз некалькі хвілін у лазні праз мыльную пену і густую пару жанчыны ўбачылі сваё начальства. Некаторыя падумалі, што гэта здань, але іх адарозіў крозны голас сапраўднага жывога Ефімава.

— Што вы тут робіце?

— Мыемся,—наіўна адказалі жанчыны.

— А хто вам сказаў мыцца?

— Мы самі. Чыталі, што чыстата карысна для здароўя.

— Вам прыдзецца пакінуць лазню, — сказаў Ефімаў, не паддаючыся на іх агітацыю.

— Таварыш дырэктар, дайце нам хоць хвілін дзесяць, каб мыла змыць, — прасілі жанчыны.

Але-ж Ефімаў чалавек культурны, ён ведае, як з людзьмі абыходзіцца.

Выбірайцеся, кажа, каб вашага і духу тут не было. У мяне самога, кажа, пад пахамі свярбіць.

Ну, а калі ў такога начальства пад пахамі засвярбела, дык тут ужо спрачацца не прыходзіцца. Праз хвіліну ў мыле і пене выкаціліся жанчыны з лазні, чырвоныя не столькі ад пары, колькі ад абурэння. Дома дамываліся яны ў начоўках і пэбрах, успамінаючы цёплым словам сваё спагадлівае начальства.

Такой культурнасцю прасякнута і ўся гаспадарчая і адміністрацыйная дзейнасць Ефімава. Калі касір **Лапікоўскі** і былы бухгалтар **Вінаградаў** растрацілі першы 981 рубель, а другі 600, то Ефімаў да адказнасці іх не прыцягнуў, — гэта-ж было-б свінства ў дачыненні да сваіх сяброў, а Ефімаў-жа чалавек культурны, нічога агульнага з свінствам не мае.

У новым, нядаўна збудаваным доме брыгад і гразь. Праз дзіравы дах вала лецца ў кватэры. Але Ефімаў-жа чалавек культурны, ён гэты бруд навокал абыходзіць, каб не запэцкацца.

Сельскагаспадарчы інвентар у Ефімава не ляжыць дарэмна дзе-небудзь пад павеццю, а пасеены па ўсёй тэрыторыі соўгаса. Магчыма, што ў выніку гэтай сяўбы з'явіцца якая-небудзь новая культура, скажам — азімыя плугі ці жняяркі. Які ўраджай ад такой сяўбы збярэ Ефімаў вясной, мы можам толькі здагадвацца.

У такога культурнага чалавека і жонка, зразумела, культурная. Два боты — пара, як людзі кажуць. Галоўным сваім абавязкам лічыць яна клопаты аб здароўі рабочых і служачых соўгаса.

Прычым асабліва чамусьці клапоціцца яна аб здароўі мужчын. Аднаго разу, напрыклад, мыючыся ўсё ў той-жа лазні, мужчыны праз мыльную пену і густую пару ўбачылі жонку свайго начальніка. Яна прышла сюды з пэрдым намерам зрабіць медыцынскі агляд. Мы не ведаем, ці адбыўся гэты медагляд, ці задаволіў ён жонку Ефімава, не ведаем, што адказалі мужчыны на яе прапанову,—можа адказалі такое, што мы ўсёроўна не надрукавалі-б, хоць бы і ведалі, — але самая спроба наладзіць такі медагляд сведчыць аб тым, што гэта жанчына ў поўнай меры варта быць жонкай Ефімава.

У соўгасе Загараны ёсць людзі сумленныя і працавітыя, адданыя сваёй справе: цялятніца **Марфа Сямёнава**, якая даглядае 30 цялят замест 18; **Канапельская**, якая даглядае 100 кароў замест 50-ці; загадчык фермы Максімец, які добра арганізаваў працу на ферме і многа іншых. У соўгасе ёсць больш ста галоў добрай малочнай жывёлы. Але там ёсць і такія стваранні, ад якіх ні шэрсці ні малака, адна толькі страта, якія толькі глумяць совецкія харчы і шкодзяць справе. Чым хутчэй ад іх вызваліцца, тым здаравей будзе совецкай гаспадарцы.

И. КРАПІВА.

ПІСЬМЕННІКІ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ЯНКА МАЎР

Стаўшы пісьменнікам, Янка Маўр застаўся верным традыцыям прынцыпам сваёй шматгадовай педагагічнай дзейнасці.

Сваімі першымі кнігамі для дзяцей пісьменнік працягвае лекцыю замяніўшы кафедру настаўніка кнігай для па-за школьнага чытання «Чалавек ідзе» — першы літаратурны крок Янкі Маўра. Ён такі-ж слабы і нясмелы, як першы крок яго героя — дагістарычнага чалавека.

Але Янку Маўра не збянтэжыла гэта няўдача. Ён ведае інтарэсы сваіх чытачоў, авалодвае тымі «таямніцамі», якія іх цікавяць, і таму, пвёрда рашыўшы пісаць для дзяцей, ён выбірае прыгодніцкі жанр.

Кнігі Маўра насычаны прыгодамі, якімі юныя чытачы вельмі захапляюцца. Папуасы і індыйцы заўсёды вабілі дзяцей тою своеасаблівасцю, якая адрозніваё іх ад нас, еўрапейцаў. Дзёрзкі афрыканскіх джунгляў, індыйскія паляванні усялякія бойкі чырвонаскурых плямёнаў, іх стракатае адзенне — усё тое што ўзведзе на буржуазнымі пісьменнікамі ў экзотыку, выклікала контрыступленне совецкага пісьменніка.

Ён досыць умела разбівае экзатычнае ўяўленне аб прывабных гарачых краінах, прыводзячы чытача да рэальнасці. Ён старанна даводзіць чытачу, што наша навакольнае асяроддзе не менш цікавае («Палескія рабінзоны»).

Калі Чукоўскі гаворыць дзецям
В Африке ужасный
Вармалей.
Он бегает по Африке
И кушает детей, —

для таго, каб адцягнуць іх мары ад далёкіх невядомых краін, то Маўр гэта робіць шляхам прадастаўлення ім «сваёй Афрыкі». Кнігай «Палескія рабінзоны» Маўр не дрэнна справіўся з гэтай задачай.

«Далёкія краіны» — пануючая тэма Маўра. Галоўны яго сродак —веданне геаграфічнага матэрыялу. Гэта фон, на якім Маўр разгортвае прыгоды, што складаюцца з канкрэтных фактаў, растваравочыхся ў мастацкім вымысле. Гэта панаванне геаграфічнага матэрыялу абівае Маўра на дыдактыку (навязванне навуковых даных), мастацкая форма падмяняецца публіцыстыкай, што знижае мастацкую якасць яго твораў. Такія творы Янкі Маўра «Амок», «У краіне райскай птушкі».

Але галоўнае, што ў гэтых творах выпукляецца, гэта слабое ўяўленне пісьменніка аб тэорыі марксізма-ленінізма, адсутнасць яснага, правільнага ўсведамлення класавых і партыйных суадносін у тых краінах, аб якіх ён піша.

Гэта асабліва адчуваецца ў пазнейшым творы Янкі Маўра — у «Аповесці будучых дзён». Тут Маўр не зусім ясна бачыць перспектывы социялістычнага будаўніцтва, няправільна ўяўляе розніцу паміж социялістычнымі формамі грамадства і комуністычнымі, а чаго вынікае такая блытаная форма будучага грамадства ў гэтым яго творы. Гэтым значным для пісьменніка недахопам тлумачыцца і недастатковая актыўнасць Маўра ў літаратурнай грамадскасці ў гады разгорнутай класавай барацьбы на літаратурным фронце за совецкую літаратуру.

Гэтага не мог не адчуваць Янка Маўр. На гэта ён натыкнуўся і тады, калі пачаў работу над гістарычным раманам з далёкага мінулага. Але патрэбен быў штуршок, які прымусіў-бы пачаць вучэнне нанава. Гэтым штуршком і з'явілася для Маўра пастанова ЦК ВКП(б) аб літаратурных арганізацыях.

Гэты год можна лічыць пачаткам вывучэння Маўрам «асновы ўсіх асноў» — тэорыі Маркса—Леніна і Сталіна, пачаткам сваёй перабудовы. Аднак, змяненне светапогляду, замена старых поглядаў і навыкаў на зусім іншыя даюцца Маўру не лёгка. Перабудова ішла і яшчэ ідзе пакутна і доўга.

Сур'ёзнае, глыбокае вывучэнне тэорыі марксізма-ленінізма, творчы ўздым і палітычная актывізацыя характарызуюць апошнія гады творчасці Янкі Маўра.

Кніга «Т.В.Т.» (1934 год), за якую Янка Маўр атрымаў першую прэмію на конкурсе дзіцячай літаратуры, напісана жыва, весела і цікава. Гэта кніга выклікае ў чытачоў здаровую ўсмешку і мае вялікую арганізуючую сілу.

Янка Маўр прышоў у літаратуру не маладым, але гэта не перашкаджае яму быць маладым, поўным сіл і бадзёрасці ў сваёй творчасці. Недарма сотні тысяч чытачоў любяць свайго Маўра і адчуваюць у ім свайго добрага прыяцеля.

С. ДАВІДОВІЧ.

ГУТАПЕРЧА

Лесахімічная лабараторыя Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі ў Гомелі паспяхова праводзіць работу па атрыманню гутаперчы з берэсклету хмызнякоў, якія маюць вялікае пашырэнне ў лясах БССР*).

Разам з каўчуком у выпуску многіх вырабаў прымяняецца гутаперча. Гутаперча мае з каўчуком падабенства па хімічнай прыродзе і адрозніваецца ад яго некаторымі фізічнымі ўласцівасцямі: большай цвёрдасцю, стойкасцю да тэрмічных уздзеянняў, да кіслот, шчолачаў, вялікай водаўпорнасцю і высокімі электраізаляцыйнымі ўласцівасцямі. Яна незамяніма пры вырабе падводных электракабеляў, манжет і гідраўлічных рухавікоў і цэлага ряду іншых вырабаў. У сувязі з меншымі магчымасцямі здабывання гутаперчы і асобай яе каштоўнасцю для ряду найбольш адказных вырабаў, гутаперча цэніцца ў 6—10 разоў даражэй, чым каўчук.

Побач з паспяховым вырашэннем выпрацоўкі сінтэтычнага каўчука і знаходжаннем шматлікіх каўчуканосаў, знойдзена значная колькасць гутаперчы ў кары карэнняў і сцяблоў хмызнякоў, якія растуць у нашых лясах. У сярэдзіне бягучага года намі былі даследаваны барадаўчаты і еўрапейскі берэсклеты з лясоў БССР на ўтрыманне гутаперчы. Даныя хімічных аналізаў гавораць, што ўтрыманне гутты ў кары карэнняў у сярэднім 8—10 проц. Асобныя ўзоры далі 12, 14 і 15, 23 проц. гутаперчы, што з'яўляецца вельмі вялікім выхадам для барадаўчатага берэсклету БССР. Еўрапейскі берэсклет дае 4—5 проц. гутты.

Узоры для даследвання збіраюцца ў розных раёнах БССР. Ахоплены 8 тысяч лесу ў 5 леспрамгасах з рознымі глебагрунтовымі і лесаводчымі ўмовамі. Вывучаюцца выгады гутаперчы ў залежнасці ад узросту хмызнякоў берэсклету. З узораў знімаецца і высушваецца кара, якая мелецца ў дробныя апілкі. Для аналізаў бярэцца апілкі аднолькавай велічыні. У апараце Сансле ўтвараецца вытяжка (хлараформа-ацэтонавая) з кары смалістых вяшчэстваў і гутаперчы. Пасля ўдалення смалы, атрымліваецца чыстая гутаперча.

Калі лічылася рэнтабельным атрымліваць гутаперчу з лісцяў дрэва эйкомії, якая дае да 4 проц., то кара берэсклету з 10—15 проц. гутаперчы з'яўляецца несумненна больш багатым гутаперчаносам. Раней нідзе непатрэбны хмызняк стаў цяпер каштоўнай сыравінай.

Нашай далейшай работай будзе даследванне кары сцяблаў, дрэўніны і лісця данай і іншых хмызнякоўых парод у лясах БССР, а таксама на аснове даследвання даць самыя лепшыя глебагрунтовыя і лесаводчыя ўмовы для развядзення больш хуткага і больш багатага гутаперчай берэсклету. Здольнасць разводзіцца чаранкамі дае магчымасць на працягу кароткага часу арганізаваць у БССР цэлыя берэсклетавыя плантацыі.

А. СКРЫГАН.

Старшы навуковы работнік лесахімічнай групы БелАН пры Беларускім навукова-даследчым інстытуце лясной гаспадаркі.

*) Гл. «Звязду» ад 24 снежня.

НОВЫЯ ЛЯСНЫЯ КУЛЬТУРЫ

У гэтым годзе трэст Лесбел памячае лесакультурныя работы па пасеву і пасадцы лесу на плошчы 17 тыс. гектараў. У выглядзе вопыту мяркуецца правесці пасадку іншаземных дрэўных парод, як напрыклад, амерыканскай жоўтай сасны, піхты «Дутласье», японскай ліственіцы і т. д.

СТАХАНАЎСКІЯ ЗМЕНЫ І СУТКІ

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу). 4 студзеня трэцяя стахаНаўская змена віцебскага лесазавода імя «Правды» выканала план на 173 процанты.

Дырэктар завода АЛЬТШУЛЕР.

***

ДОБРУШ. (Па тэлеграфу). 5 студзеня на цэлюлозным заводзе былі праведзены стахаНаўскія суткі. Завод выпусціў 50 тон цэлюлозы замест 40,7 тоны па норме. Рыхтуемся правесці стахаНаўскія суткі па папяровому аддзелу і ўсёй фабрыцы «Герой працы».

Дырэктар фабрыкі ГАЙСІН.

РЭКОРДНАЯ ВЫПРАЦОЎКА КЛЁПКІ

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ, 8 студзеня. (Кар. «Звязды»). 5 студзеня стахаНаўцы-кляпальшчыкі Буда-Кашалёўскага леспрамгаса Шрэйтэр Эдуард і Кетэль Карл паставілі рэкорд па выпрацоўцы мемельскай (экспартнай) клёпкі. За 8 гадзін яны зрабілі па 35 клёпак замест сямі па норме.

ЛОСЕЎ.

НА СУСТРЭЧУ ДА БУСЫГІНА

МАГІЛЁЎ, 8 студзеня. (БЕЛТА). СтахаНавец аўтарамонтнага завода кавэаль Астапаў у снежані давёў сваю выпрацоўку да 270 процантаў. У апошнія дні ён выконвае сваю норму на 300 проц. У снежані ён атрымаў 500 рублёў замест ранейшых 200—250 руб. 6 студзеня тав. Астапаў выехаў у Маскву для азнаямлення з работай аўтазавода імя Сталіна і аўтарамонтнага завода № 2. Пасля Масквы тав. Астапаў паедзе ў горад Горкі на аўтазавод імя Молатава для сустрэчы з тав. Бусыгіным, вопыт работы якога ён перанясе на сваё прадпрыемства.

ВУЧОБА СТАХАНАЎЦА ТАВ. РУШКО

СтахаНавец бабруйскага драваапрацоўчага камбіната тав. Рушко пачаў рыхтавацца да здачы экзамена на званне тэхніка. Да яго прымацаван інжынер, які праходзіць з ім агульнаадукацыйныя і тэхнічныя дысцыпліны.

Заводаўпраўленне камбіната дало сям'і Рушко кватэру з трох пакояў з кухняй. Кватэра мэбліравана за кошт заводаўпраўлення.

СТАХАНАЎЦЫ МТС—НА КУРОРТЫ І Ў ДАМЫ АДПАЧЫНКУ

ЦП саюза работнікаў МТС паслаў на курорт у Кісловодск і ў Звенігарад 9 стахаНаўцаў Дзяржынскай, Капыльскай, Слуцкай і іншых МТС. У дамы адпачынку паехала 5 чалавек. Усяго на курортах і ў дамах адпачынку будуць адпачываць 72 стахаНаўцы — трактарысты і работнікі МТС. (БЕЛТА).

РАБОТА ЦАГЕЛЬНЫХ ЗАВОДАЎ ЗІМОЙ

З 50 цагельных заводаў рэспублікі зараз працуюць толькі 12. Упершыню ў гэтым годзе пачалі працаваць зімой менскія цагельныя заводы №№ 3, 5 і 6, гомельскі завод № 6 і віцебскі № 2. Практыка паказала, што ў зімовых умовах можна даць вялікі выпуск прадукцыі. Напрыклад, на гэтых заводах пры норме ў 22 тыс. цаглін прэсы выпускаюць па 28—30 тысяч.

Самадзейная оперная студыя

Пры клубе імя Леніна Гомельскага чыгуначнага вузла нядаўна створана оперная самадзейная студыя. У яе ўваходзіць 35 асоб. Гэта ў большасці рабочыя і інжынерна-тэхнічны персанал вузла, іх жонкі і дзеці. Сярод студыйцаў нямала здольных спевакоў-салістаў. З іх можна адзначыць Юраўца — былога памочніка машыніста, Іофе — токара паравознага дэпо, Бурую і Пашкевіч — жонак інжынерна-тэхнічных работнікаў.

Студыя працуе зараз над операй «Еўгені Онегін». Кіраўнік студыі т. Сокалава з'яўляецца добрым пастаноўшчыкам голасу, але ёй не пад сілу быць і мастацкім кіраўніком, і піяністкай, і балетмайстрам і чым вы толькі хочаце. Таму ў рабоце студыі бываюць прарывы. Праўленне клуба прабавала было запрасіць на дапамогу некаторых спецыялістаў з Гомельскай музычнай школы і тэхнікума, але тыя пажадалі празмерную аплату за свае паслугі, і ад такой дапамогі прышлося адмовіцца.

У снежні месяцы частка студыйцаў прымала ўдзел у алімпіядзе самадзейнага мастацтва чыгуначнікаў цэнтральных дарог у Маскве. Удзельнікі атрымалі добры водгук, а таксама ўзнагароду. Але апрача гэтага журы алімпіяды адзначыла прафесіяналізм, слабую масавасць самадзейнага мастацтва пры гомельскім чыгуначным вузле.

Зараз пры клубе шырока разгарнулася мастацкая самадзейная работа: працуюць духавы і струнны гурткі, а таксама турток гарманістаў. У хуткім часе будзе арганізован хор з 80 асоб.

С. ШУШКЕВІЧ.

ЛІТАРАТУРНЫЯ ДНІ Ў КАЛГАСЕ

АЗАРЫЧЫ, 8 студзеня. (Уласная інфармацыя «Звязды»). Дамананвіцкая раённая газета «За большэвіцкія калгасы» паведамляе аб праведзеных літаратурных днях у калгасе «Комінтэрн», Савіцкага сельсавета. Два разы ў тыдзень у калгасе працуе гурток па чытцы твораў савецкіх пісьменнікаў і класікаў. Да гэтага часу прачытаны «Красный десант» Фурманава, «Дрыгва» Якуба Коласа, «Спать хочется» Чэхава. Старыкі-калгаснікі вельмі цікавяцца мастацкім словам. Акрамя таго, у калгасе працуе вяэрняя школа, у якой займаюцца 23 калгаснікі.

Раённы музей

За высокай агарожай стаіць прыгожы асабняк. Будынак — адзін з лепшых у горадзе. Калішні гаспадар асабняка буйны фабрыкант Рабкін для будаўніцтва яго выпісваў архітэктароў з-за мяжы. Зараз тут знаходзіцца бабруйскі краязнаўча-політэхнічны музей. У раскошных апартаментах размясціліся два дзесятка аддзелаў, кожны ў асобным пакоі.

Асабліва багаты аддзел мясцовай прамысловасці. Тут складаны варштат з чыгуналіцейнага завода імя Сталіна, такарныя варштаты завода імя Варашылава, прадукцыя лесакамбіната і т. д. На сцяне электрыфікаваная карта электрыфікацыі СССР. Вялікую частку пакоя, самага большага ў музеі, займае «куток авіяцыі», у якім знаходзіцца цэлы самалёт, разабраны па дэталях.

У аддзеле «Рэвалюцыйны рух на Бабруйшчыне» сабраны цікавыя гістарычныя матэрыялы часоў рэвалюцыі 1905 года, Лютаўскай рэвалюцыі, Вялікай Кастрычніцкай пролетарскай рэвалюцыі 1917 года, акупацыі БССР і Бабруйска немцамі і белапалякамі.

Нямала экспанатаў перадана музею рознымі арганізацыямі, прадпрыемствамі, асобнымі рабочымі.

У кнізе запісаў наведвальнікі даюць высокую ацэнку музею. «Па падбору і класіфікацыі матэрыялу бабруйскі музей з'яўляецца лепшым з усіх бачаных мною правінцыяльных музеяў», — піша прафесар В. Папоў. Амерыканскі інтурыст, член клуба імя Джон Рыда ў Бастоне, Шамбад заяўляе: «Я быў прыемна здзіўлен, нечакана ўбачыўшы такую выдатную ўстанову, якую стварылі таварышы ў горадзе Бабруйску». Музей наведалі калгаснікі Таўкачоў Фёдар, Архіпенка Павел, Парахневіч Міхась з калгаса «Большэвік». «Уся абстаноўка, — пішуць яны, — вельмі добрая. Жадаем, каб калгаснікі бывалі тут часцей, бо карысці вельмі шмат». «Наведалі музей 30 акцябрят. Уражанні ў дзяцей вельмі добрыя. Важатая атрада Курынец».

За 1935 год музей наведала 1.020 арганізаваных груп, не лічачы «неарганізаваных» адзіночак. Усяго музей наведала каля 40 тысяч чалавек.

Дырэктар музея Ц. Я. Слівін, які многа папрацаваў над стварэннем музея, адначасова з'яўляецца экскурсаводам і рахункаводам. Невядома чаму Наркомасветы да гэтага часу не зацікавіцца музеем. Між тым, варта адзначыць, што бюджэт яго ў 1935 годзе складаў 6 тысяч рублёў, якіх ледзь хапіла на зарплату абслугоўваючаму персаналу і на сякіятакія дробязі.

П. ЧЫКУН.



Будынак бабруйскага музея (здымак зроблен улетку).

ГАЗЕТЫ І ЖУРНАЛЫ Ў КАЛГАСНАЙ ВЁСЦЫ

Вынікі гадавой падпіскі на газеты і журналы паказалі велізарны рост культурнасці калгаснай вёскі. Вось даныя Беларускага аддзялення «Саюздрука». Штодзённа вёска атрымлівае звыш 600 тыс. экземпляраў цэнтральных і рэспубліканскіх газет і журналаў. Апрача «Праўды», «Известий», «Комсомольской правды» і іншых маскоўскіх газет, калгаснікі, рабінны і сельскі актыў выпісалі на 1936 год 31 тыс. экземпляраў «Крестьянской газеты», 13 тыс. экземпляраў журнала «Колхозный бригадир». Віднае месца ў падпісцы займаюць журналы «Большевик», «Партийное строительство» і іншыя. На «Звязду» падпісалася 50 тыс. чалавек, на «Чырвоную змену» — 26 тыс. 90 тыс. калгаснай дзетвары выпісваюць «Піонер Беларусі». Большасць падпісчыкаў выпісалі газеты і журналы на працяглыя тэрміны.

ПАКУПКА КАЛГАСА «ЧЫРВОНЫ ПАГРАНІЧНІК»

ЖЫТКАВІЧЫ, 9 студзеня. Прыгранічны калгас «Чырвоны пагранічнік», Браніслаўскага сельсавета, гэтымі днямі паслаў у Менск комсамольскага арганізатара — брыгадзіра калгаса Танчынскага Захара. Яму даручана купіць для калгаса гармонік, патэфон і прылады для зімовага спартыўнага сезона. У жыцяцвіцім культмагу ёсць гармоніі, але невысокай якасці і калгас рашыў купіць высокакласны інструмент. Разам з заможным жыццём з'яўляецца патрэба ў вясёлым, культурным адпачынку.

В. СУХОЦКІ.

ЗАМОЖНАЯ СЯМ'Я КАЛГАСНІЦЫ ЛАЗАРАВАЙ

МАГІЛЁЎ, 8 студзеня. (Кар. «Звязды»). Калгасніца калгаса імя Варашылава, Княжыцкага сельсавета, Лазарава Наталля з братам і старой маткай за 1935 г. выпрацавала 800 працадзён. Сям'я мае хлеб ураджаю 1934 года. За праданыя лішкі хлеба і атрыманыя на працадні грошы сям'я набыла 2 нікеліраваных ложкі, два жаночых паліто, 3 пары хромавых батінак, 4 пары галош, 3 пары валенак, добрую шафу і інш. У хаце чыста, многа кветак, карцін.

РОСТ СПАЖЫВАННЯ КАНДЗІЦЕРСКА-БУЛАЧНЫХ ВЫРАБАЎ

Калгасная вёска БССР прад'яўляе вялікі попыт на кандзіцерска-булачныя вырабы — баранкі, французкія булкі, венскую здобу, пернікі. Белжаапсаюз у мінулым годзе штомесячна рэалізаваў на вёсцы звыш 300 тон піпанічна-булачных вырабаў і венскай здобы. У гэтым годзе вытвочка павялічваецца да 1 тыс. тон у месяц. Расшыраюцца раённыя і сельскія хлебапякарні, будуюцца новыя печы. У студзені-лютым заканчваецца пабудова 15 каперацыйных хлебапякарэнь у новаарганізаваных раёнах БССР.

Газетныя радкі

РАХУНКІ КАЛГАСНІКАЎ У ДЗЯРЖБАНКУ

Дасеяць калгаснікаў калгаса «Юны мір», Галубоўскага сельсавета (Дрэсенскі раён), адкрыў свае асабістыя бяручыя рахункі ў раённым аддзяленні Дзяржаўнага банка. («Большэвік Полаччыны»).



Заняткі па боксу студэнтаў тэхнікума фізкультуры. Не здымкі чэмпіён БССР у найлягчэйшай вазе т. Карсена трэніруецца са студэнтам т. Мірутка.

Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

НОВЫЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ МАШЫНЫ

Машынабудаўнічыя заводы Наркамата мясцовай прамысловасці БССР прыступілі да выпуску ряду новых сельскагаспадарчых машын, скапіраваных у значнай частцы вытвараемых БССР. Калгасы, машынатрактарныя станцыі і саўгасы атрымаюць у бягучым годзе ад мясцовай прамысловасці 100 балотных плугоў Фомічэва, 25 трактарных ханаважацелеў, 250 прыводных пакерэвак тыпу пакерэвакі «Дазарэя», 500 прыводаў № 2 для інсэктыцыдных пунктаў у калгасах і рад іншых машын. Віцебскі завод імя Кірава асвойвае выраб інсэктыцыдных машын Антонова, якіх будзе выпушчана 800 штук. Апрача таго металаапрацоўчыя заводы БССР дадуць у бягучым годзе запасных частак да сельскагаспадарчых машын на 1 мільён руб.

ЯЎРЭЙСКІ ТАЛКОВЫ СЛОЎНІК

Інстытут літаратуры і мовы БелАН працуе над складаннем яўрэйскага талковага слоўніка. Над слоўнікам працуюць навуковыя работнікі Гольмшток, Шкляр, Рохлін і Катовіч. Палітрэдакцыя — Агурская, Апароўіча і Фрыдмана. Для лінгвістычнай рэдакцыі з Масквы запрошан прафесар Зарэцкі. Слоўнік разлічан на 40—50 тыс. слоў і выйдзе ў двух томах. Першы том павінен выйсці ў канцы гэтага года. Падрыхтавана ўжо каля 11 тыс. слоў. Паводле рашэння прэзідыума БелАН слоўнік павінен быць складзен да 20-й гадавіны Кастрычніка. Талковы яўрэйскі слоўнік выдаецца ўпершыню ў гісторыі яўрэйскай літаратуры. (БЕЛТА).

КОРАТКА

(АД КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ЗВЯЗДЫ»)

* **400 школьнікаў і студэнтаў БССР** выедуць на час канікул у экскурсіі ў Ленінград, Маскву і на Дняпрагэс. Першыя групы школьнікаў ужо выехалі з Менска ў Ленінград.

* **Чаранкі ста відаў аранжарэйных расцін** атрымаў з Масквы батанічны сад Беларускай акадэміі навук. Чаранкі высаджваюцца ў цяплічках саду.

ГАНДЛЁВАЯ ХРОНІКА

* Менхарчгандлю перадана гандлёвая сетка горспажыўсаюза. Зараз Менхарчгандаль складаецца з чатырох аддзелаў: гародніннага, бакалейна-гастранамічнага, хлебнага і трэста «Ларок».

* Гандаль запалкамі паводле пастановы Народнага камісарыята ўнутранага гандля БССР будзе ва ўсіх бакалейных і табачных аддзяленнях магазінаў «Гастраном» і «Бакалея». Грошы за запалкі атрымлівае непасрэдна прадавец.

* Менскі трэст грамадскага харчавання ліквідаваўся. Усе сталовыя перайшлі ў ведзенне трэста кафэ і рэстаранаў.

ЗДАРЭННІ

* **«Таварыш».** Шоферу 2-й менскай пажарнай каманды С. Ф. Лютынскаму прыбыла з Бабруйска пісьмо, у якім яго просілі паведаміць імя па бацьку, каб выслаць яму доўг — 200 руб. Пісьмо перахапіў студэнт чацвертага курса медрабфака А. С. Дзерновіч, які пражывае ў адным доме з Лютынскім. Ад імя Лютынскага ён напісаў наступны адказ: «Я паведаміў-бы Вам імя па бацьку, але я згубіў пашпарт і калі-б Вы і выслалі грошы, дык я іх атрымаць не змагу. Вышліце грошы майму таварышу, які жыве са мной у адным доме і кватэры». Калі прыбылі грошы, Дзерновіч атрымаў іх і прысвоіў сабе Лютынскі, не атрымліваючы доўгу, паехаў у Бабруйск, дзе даведаўся аб афёры. Злачынца затрыман. Грошы звернуты Лютынскаму.

* **Няшчасны выпадак.** 7 студзеня на рагу Нямігі і Комсамольскай вуліц, у Менску, рабочы склада Беларускага кіраўніцтва сувязі П. Л. Каплан, 68 год, вылазячы з аўтамашыны, пасклізнуўся і забіўся. Труп накіраван у судова-медыцынскі інстытут для экспертызы. Вядзецца расследванне.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1 — 9 студзеня ВЯЛІКАДУШША. Пачатак у 8 г. веч. Білеты прадаюцца ў касе тэатра.

Гукавы кінотэатр „Чырвоная зорка" — Гістарычны гукавы фільм КАРМЕЛЮК

ГУКАВЫ КІНОТЭАТР «ПРОЛЕТАРЫЙ» — Амерык. гукавы фільм Чалавек-невідзімка

ГУКАВЫ КІНОТЭАТР «Інтэрнацыянал» — Гукавы мастацкі фільм ГРАНІЦА „СТАРОЕ ДУДЗІНА"

Кіно «СПАРТАК» — Выдатны фільм „Пуцёўка ў жыццё" (нямы варыянт)

Касцюковіцкая арцель інвалідаў «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», Касцюковіцкага раёна, згодна пастановы прэзідыума РВК ад 25 лістапада 1935 года,

ліквідуецца.

Усе ўстановы і асобы, якія маюць прэтэнзіі павінны прад'явіць іх да 15 студзеня 1936 года. Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць. Адрас ліквідацыйнай камісіі: Касцюковіцкі РВК (пакой райсабеза). ЛІКВІДКОМ.

ПАТРЭБНЫ прыбіральшчыцы. Зварачацца ў выдавецтва „ЗВЯЗДЫ", Совецкая, 63.

АДКРЫТА ПАДПІСКА на ЛЮТЫ і наступныя месяцы 1936 г.

на выданні выдавецтва „ЗВЯЗДЫ"

ГАЗЕТЫ:

„ЗВЯЗДА" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 2 р. 50 к., 3 м. — 7 р. 50 к., 6 м.—15 р., 12 м.—30 р.

„ОРКА" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 1 р. 20 к., 3 м.—3 р. 60 к., 6 м. — 7 р. 20 к., 12 м. — 14 р. 40 к.

„РАУДОНАСІС АРТОЯС" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 30 к., 3 м. — 90 к., 6 м. — 1 р. 80 к., 12 м. — 3 р. 60 к.

ЖУРНАЛЫ:

„БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 40 к., 3 м. — 1 р. 20 к., 6 м. — 2 р. 40 к., 12 м. 4 р. 80 к.

„БОЛЬШЭВІЦКІ ДРУК" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 1 р., 3 м. — 3 р., 6 м. — 6 р., 12 м. — 12 р.

„РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ" ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: 1 м. — 40 к., 3 м. — 1 р. 20 к., 6 м.— 2 р. 40 к., 12 м. — 4 р. 80 к.

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях, грамадскімі арганізатарамі і пісьманосцамі.

Навучальны камбінат Бел. аддз. «СОЮЗОРГУЧЕТ» абвяшчае набор курсантаў на 5-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы інструктароў для райза для работы на раёне.

На курсы прымаюцца асобы, якія маюць стаж работы па рахункаводству па падвойнай сістэме не менш 2-х год і асвету не ніжэй сямі класаў. Стыпендыя ад 115—140 р., у залежнасці ад акадэм. паспяховасці, і кватэрных 30 руб. у месяц.

Да заявы трэба прыкласці наступныя дакументы: заверэную анкету, даведку аб соцстановішчы, адукацыі, узросце, працоўным стажы, аслабленні ад апошняга месца работы. Прыём па камандыроўках МТС, райза і калгасаў. Тэрмін падачы заяў — да 20 студзеня. Аб залічэнні і пачатку заняткаў будзе паведамлена па пошце. Для адказу трэба прыкласці марак на 40 кап. Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: г. Менск, Барысаўскі тракт, 55, дашкольны тэхнікум, навучальнаму камбінату «Союзоргучет». Канцэлярыя працуе з 3,5 гадз. дня да 9 гадз. вечара.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Белдзяржінстытут удасканальвання ўрачоў даводзіць да ведама раённых аддзелаў аховы здароўя і ўрачоў, што ёсць навуковыя камандыроўкі на 1936 год у гор. Маскву па наступных спецыяльнасцях:

На сакавік месяц—хірургія, тэрапія інфекцыйныя (удасканальванне).

На красавік месяц — тэрапія, хірургія (спецыялізацыя), венерапогія, прам. санітарыя, харчовая санітарыя, педыятрыя рэн, узросту (удасканальванне).

На май месяц — бактэрэлогія (спецыялізацыя), акушораў.-гінекалогаў, эпідэміялогія, неўрапаталогія, вочныя, вушныя (удасканальванне).

Заяўкі на камандыроўкі з пераводам 800 руб. на кантракрэнт інстытута ў Беларускім аддзяленні Дзяржбанка № 532 за кожную трохмесячную камандыроўку павінны паступіць у інстытут (Совецкая, 36) не пазней 12 студзеня 1936 г.

У выпадку не атрымання ад райздрава заяўкі і грошай к указанаму тэрміну, урачы даных раёнаў будуць пазбаўлены магчымасці атрымаць на першае паўгоддзе 1936 г. навуковыя камандыроўкі ў гор. Маскву.

Дырэктар інстытута дацэнт ДАБРУСКІН.

МЕНСКАЯ ДЗЯРЖСАНІНСПЕКЦЫЯ даводзіць да ведама камендантаў інтэрнатаў і агульных памяшканняў, загадчыкаў лазнямі і пральнямі, а таксама загадчыкаў кінотэатраў, што 13 студзеня, у 8 гадзін вечара, у памяшканні медкамісіі Дзяржсанінспекцыі (Новая-Маскоўская, 24) адбудзецца НАРАДА.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб санітарным стаўленні паказаных аб'ектаў.
2. Аб сакасветпрацы.

Яўка абавязкова.

МЕНСКАЯ ДЗЯРЖСАНІНСПЕКЦЫЯ.

На падставе пастановы ўрада мягілеўскі свінаводтрэст ліквідуецца з 1 студзеня 1936 г.

Усім арганізацыям і ўстановам, якія маюць прэтэнзіі да свінаводтрэста, трэба прад'явіць іх да 15 студзеня 1936 г.

Пасля ўказанага тэрміну прэтэнзіі прымацца не будуць.

Аршанскі двухгадовы настаўніцкі інстытут абвяшчае ПРЫЁМ курсантаў на падрыхтоўчыя шасцімесячныя КУРСЫ.

Прымаюцца асобы з адукацыяй за 8 класаў па іспытах. Прыём праводзіцца да 25 студзеня.

Заняткі пачнуцца з 1 лютага 1936 года.

Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй і кватэрнымі грашыма.

Заявы і дакументы накіроўваць па адрасу: г. Орша, вул. Сталіна, 12, інстытут.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРЫ ФУРУНКУЛЕЗЕ, ЭКЗЕМЕ, ПРЫ УСЯЛЯКІХ ФОРМАХ ПАЎТОРНАГА МАЛАКРОЎЯ

ПРОДАЖ ва ўсіх аптэках і магазінах санітарыі СССР.

Пры адсутнасці на месцах высылаецца ПОШТАЙ галоўным складам інстытута па атрыманні задатку не менш аднаго рубля з кожнага флакона.

АДРАС: Харьков, ул. Артема № 12, Укр. институт эндокринологии.

ЗГУБЛЕНЫЯ І ЎКРАДЗЕНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМІ:

Сафонаў І. І. — пашпарт, Альперовіч Л. Ф. — пашпарт, Ламака Я. М. — профбілет, Быстрыцкі П. Г.— пашпарт, профбілет і вайсковы білет, Салавей М. М. — пасведчанне аб скончэнні сямігодкі, Кундраў П. А. — пашпарт, Нірман С. В — пашпарт, Баранюк В. Я. — студэнцкае пасведчанне, Берасневіч С. А. — пасведчанне асобы, Дзічкоў З. Д. — пашпарт, Даюбанаў Ф. К. — вайсковы білет, Макейчык М. П. — пашпарт, вайсковы білет і комсамольскі білет, Добкін Ф. А. — профбілет, Попель М. А. — студэнцкае пасведчанне, Прахарчук М. В.— пашпарт і пасведчанне аб скончэнні курсаў пры НКФ БССР, Хаюцін В. Л. — комсамольскі білет.

Бочкін Марк Грыгоравіч, ураджанец вёскі Дуброўкі, Застадольскага сельсавета, Багушэўскага раёна, зараз працуе ўчэнспектарам чашніцкага РАМ НКУС, мяняе прозвішча і імя на Атамановаў Макар. Асоб, маючых пратэсты да змены прозвішча і імя, просяць паведаміць чашніцкаму райбюро ЗАГСА.

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Кабінет рэдактара — 21-852. Кабінет нам. рэдактара — 25-188. Сакратарыят — 20-830. Прамысловы аддзел — 21-856. Аддзел мясцовай інфармацыі—25-189. Партыйны аддзел—21-353. Сельскагаспадарчы аддзел 21-846. Аддзел асветы літаратуры і мастацтва — 23-955. Аддзел пісем—21-899. Загадчык выдавецтва — 21-858. Бухгалтэрыя — 21-845. Аддзел аб'яў і тыражны — 21-851. АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: МЕНСК, Совецкая, 63.

Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Тыраж 106.045.

Уп. Галоўлітбела № К—8.